РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

ПАГОНЯ

№ 33 (89) 14 – 20 кастрычніка 1994 г. Кошт 50 рублёў

«Крадзі, Ігнась, пакуль савецкая ўласьць», Альбо жменька нататак пра калгасны статак - ст. 3.

Польская паліцыя не знаходзіць дзейсных мер у барацьбе нават з дробнымі злачынцамі з Усхода - ст.4.

Пакуль маўчаць нашыя гісторыкі, паміраюць апошнія сьведкі і ўдзельнікі падзей - ст. 5,6.

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАНЬНЯ НА ТЫДЗЕНЬ: Менск – Варшава – Масква - Санкт-Пецярбург.

ЗАЯВА ГАРАДЗЕНСКАЙ АБЛАСНОЙ І ГАРАДЗКОЙ РАДАЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ «АДРАДЖЭНЬНЕ».

У сувязі с падзеямі, якія адбыліся ў Горадні раніцай 5-га кастрычніка перад будынкам гарвыканкаму, а таксама ў сувязі с распаўсюджваньнем ілжывых чутак пра гэтыя падзеі, Гарадзенская абласная і гарадзкая Рады БНФ "Адраджэньне" заяўляюць наступнае:

Упершыню ў шасьцігадовай гісторыі БНФ "Адраджэньне", у час выстаўленьня пікету на нашых прадстаунікоў, а таксама на прадстаўнікоў Дэмакратычнага аб'яднаньня ветэранаў быў зроблены напад (парваны бел-чырвона-белы сьцяг, частка нашых плакатаў) і распачата бойка. Гэта зрабілі прадстаўнікі праімперскіх, пракамуністычных арганізацый Горадні: ПКБ, Славянскі Сабор "Белая Русь", Саюз моладзі, гарадзская арганізацыя ветэранаў, Саюз афіцэраў і іншых. Але гэтыя экстрэмісты атрымалі годны адпор з боку прадстаўнікоў БНФ і Дэмакратычнага аб'яднаньня ветэранаў. У той жа час мы ведаем, што большасьць людзей, якія прысутнічалі пры гэтых ганебных падзеях з супрацьлеглага боку, былі ўцягнуты ў іх з дапамогай ілжывай агітацыі і падману.

Мы лічым, што падзеі, якія адбыліся, сьведчаць аб тым, што праімперскія і пракамуністычныя сілы адчулі небясьпеку для сябе з-за таго, што народ Беларусі пачынае адчуваць сваю годнасьць і адказнасьць за лёс Бацькаушчыны.

Мы яшчэ раз нагадваем, што Беларускі Народны Фронт заўсёды стаяў і стаіць толькі за мірны шлях дасягненьня сваіх мэтаў. За намі праўда.

Грамадзяне Беларусі! Не дазволім утварыцца на нашай зямлі другому Карабаху.

ГІСТОРЫЯ ІМ НЕ НАВУКА

5 кастрычніка пасьля тыднёвага перапынку аднавіла сваю работу сесія Гарадзенскага гарадзкога Савета народных дэпутатаў, якая павінна была вырашыць пытаньне перайменаваньня і вяртаньня гістарычных назваў некаторым вуліцам горада. Ёй папярэднічаў інцыдэнт, які паказаў, што пракамуністычна і праімперска настроеныя сілы Беларусі (прынамсі некаторыя іх члены) здольны даказваць сваю правату толькі з дапамогай кулакоў.

У гэты дзень прадстаўнікі Беларускага Народнага Фронту, альтэрнатыўнай ветэранскай арганізацыі, грамадзка-палітычнага аб'яднаньня імя К.Каліноўскага вырашылі выставіць перад будынкам гарвыканкама пікет у падтрымку таго, каб назвы вуліцаў Горадні былі пазбаўлены палітычнага зьместу. Але гэта не ўваходзіла ў планы прыйшоўшых на пляц больш паўсотні чалавек "левых": членаў НРБ, Саюза Афіцэраў, Славянскага Сабора, ПКБ, ЛКСМБ, ветэранаў, якія ўбачыўшы бел-чырвона-белы сьцяг, пачалі лямантаваць: "Вон отсюда, фашисты. Вам нечего тут делать. Сколько долларов вам заплатили?" А зразумеўшы, што іх значна болей, пачалі дзейнічаць: штурхаць дэмакратаў, хапаць за адзеньне, вырываць з рук і рваць плакаты і сьцяг, а некаторых біць кулакамі і нават палкамі, у выніку чаго расьсеклі брыво прафесару Гарадзенскага медыцынскага інстытута А.Астроўскаму. Толькі кроў апошняга ахалодзіла пыл чырвона-карычневых. Напэўна, хапіла розуму ўсьвядоміць, што далейшае разьвіцьцё падзей можа быць не на іх карысьць.

Калі, як кажуць, інцыдэнт быў вычарпаны, з'явіліся супрацоўнікі міліцыі (цяжка паверыць, што іх калегі, пераапранутыя ў цывільнае, не былі дзесьці побач у час бойкі). Завадатары беспарадку пачалі пераконваць іх, што "всё начали" іх праціўнікі. Вінаватых не знайшлі (ці не сталі шукаць?).

А потым была сесія. Пачалася яна з зачытаньня старшынёй гарсавета Г.Крупенка зварота гарадзкой арганізацыі саюза "Ачышчэньне" да дэпутатаў, у якім патрабавалася зьняць з парадку дня сесіі пытаньне аб перайменаваньні вуліц "инициированное течениями правого толка". Маўляў, яно падзяляе жыхароў Горадні на два варожых лагеры, а становучае вырашэньне яго запатрабуе значных сродкаў, якія б можна было накіраваць на паляпшэньне дабрабыту людзей.

Своеасаблівым адказам "ачышчэнцам" можна лічыць выступ намесьніка старшыні гарвыканкама, старшыні гарадзкой тапанімічнай камісіі А.Мілінкевіча. Ён нагадаў дэпутатам, што і заканадаўства краіны, і адпаведныя рашэньні вабласнога і гарадзкога Саветаў рэкамендуюць мяняць палітызаваныя назвы вуліц, і што вызначэньнем таго, якія з іх трэба пераймяноўваць займаецца камісія ў складзе 24 чалавек, сярод якіх тры прафесары, 6 дацэнтаў - людзі розных палітычных поглядаў. Аляксандр Уладзіміравіч падкрэсьліў, што насельніцтва пераважна абыякава ставіцца да перайменаваньня . Ім была выказана нязгода з тым, што прапануемыя назвы антысавецкія, паланістычныя, русафобскія. Ён, у прыватнасьці,паведаміў, што беларус па нацыянальнасьці, і што ніхто не зьбіраецца мяняць назву вуліцы Карбышава, які з'яўляецца ўдзельнікам абароны Горадні ў чэрвені 1941 года, а той жа Пажарскі - не паплечнік Мініна, а афіцэр, які загінуў у 1938 годзе ля возера Хасан. Па словах спадара Мілінкевіча, выдаткі, зьвязаныя з перайменаваньнем, мізерныя, і нават знойдуцца спонсары, якія прафінансуюць яго. Выказаўшы павагу да ветэранаў, іх рабоце па патрыятычнаму выхаваньню моладзі, ён сказаў: "Нельга выхаваць патрыятызм толькі на глебе Вялікай Айчыннай вайны".

У падтрымку прапаноў тапанімічнай камісіі выказаліся дэпутаты гарсавета Ю.Мацко, У.Волкаў, А.Чырун, дэпутаты аблсавета А.Пяткевіч, В.Задаля, нагадаўшы прысутным, што ў той жа Расеі мяняюць ня толькі назвы вуліц, але і гарадоў. А Т.Маліноўская прапанавала стварыць часовую камісію па збору сродкаў на перайменаваньне вуліц і заклікала адмовіцца ад палітычных гульняў.

Супрацьлеглыя думкі выказаны А.Філінам і Г.Гірасам, апошні нават прапанаваў аб'явіць мараторый на дзейнасьць гарадзкой тапанімічнай камісіі.

Потым пачалося галасаваньне. Больш за 61 дэпутата (колькасьць галасоў, неабходная для прыняцьця станоўчага рашэньня) выказалася за тое, каб вуліца Учхозаўская насіла імя Я.Каханоўскага, заснавальніка адзінага ў рэспубліцы Гарадзенскага заапарка, Чапаева - імя М.Васілька, беларускага паэта, які ў свой час жыў на ёй, бульвар 60 год Кастрычніка - імя Я.Купалы, а вуліца і завулак Я.Купалы назву Купальская(-і).

АЎГУСТОЎСКІ КАНАЛ БУДЗЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ?

5-7 кастрычніка на Гарадзеншчыне знаходзіўся прадстаўнік ААН М.Каханэ, якога суправаджаў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі А.Дарафеяў. Мэта візіту - азнаёміцца з магчымасьцю рэканструкцыі Аўгустоўскага канала, які злучае польскія і беларускія рэкі і мог бы выкарыстоўвацца суседнімі краінамі ў сферы гандлю і турызму. Беларускі бок распрацаваў праектна-сметную дакументацыю ў цэнах 1991 года па рэканструяваньню сваёй часткі воднай артэрыі, але з-за фінансавых цяжкасьцяў работы па яго аднаўленьню былі спынены.

Пад час візіту разглядалася магчымасьць аказаньня фінансавай дапамогі міжнароднымі арганізацыямі (ААН, ЮНЭСКА) па рэканструкцыі трох кіламетраў беларускага адрэзку Аўгустоўскага канала.

З гэтай нагоды М.Каханэ сустрэўся з першым намесьнікам старшыні Гарадзенскага аблвыканкама М.Калацэям, старшынёй вабласнога камітэта па экалогіі П.Путро, зацікаўленымі асобамі з польскага боку, азнаёміўся з адпаведнай літаратурай, пабываў на самім канале.

РАЗВІТАНЬНЕ.

Фатаграфаваў А.ЎЛАДАСЕВІЧ.

А.ДУК.

Двух галасоў не хапіла для вяртаньня вуліцы Р.Люксембург яе ранейшай назвы Ф.Грынькевіча, рэлігійнага дзеяча, педагога, першага кіраўніка Гарадзенскага гурткà беларускай моладзі, трох - каб вуліца Пажарскага па-ранейшаму называлася у гонар К.Бекеша (венгр, палітычны і вайсковы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага), чатырох - для перайменаваньня вуліцы Бялінскага ў К.Агінскага і дзевяці - каб Сацыялістычная зноў насіла імя славутага князя Вітаўта.

Захавалі свае назвы таксама вуліцы Ўрыцкага і Ціміразева. За перайменаваньне іх у Залатарскую і Станіслававa прагаласавала адпаведна 52 і 42 дэпутаты.

Як бачна, вынік сьціспы. Але будзем спадзявацца, што хутка прыйдзе час, калі ў абарону таго, каб горад меў сваё, непаўторнае аблічча, выступяць не дзесяць ці сто яго жыхароў, а ўсё насельніцтва, і ў яго хопіць розуму выбраць дэпутатамі людзей, якія б паспрыялі адраджэньню гісторыі і культуры Горадні, усёй Беларусі.

А.ДУК.

P.S. *Як паведаміў начальнік аддзела ўнутраных спраў Ленінскага райвыканкама Горадні А.Савошчык, крымінальная справа па інцыдэнту, які адбыўся 5 кастрычніка на плошчы Леніна, не ўзбуджалася, бо пацярпелымі не пададзена адпаведная заявы.*

Хочацца думаць, што адбыўшаеся - не факт мясцовага значэньня, бо ў гэты дзень упершыню за час існаваньня незалежнай Беларусі падчас высьвятленьня адносін паміж палітычнымі праціўнікамі пралілася кроў. Упершыню "левыя" вырашылі даказаць сваю правату з дапамогай сілы. Што гэта: агонія ці рэпетыцыя новых метадаў барацьбы? Калі першае, дык неяк выцерпім, а калі другое, то гэта ўжо небясьпечна. Шлях да канфрантацыі, супрацьстаяньня можа прывесьці да расколу грамадзтва на два сапраўды варожых лагеры. Малая кроў можа пацягнуць за сабой вялікую. А можа не ў назвах вуліц ці дзяржаўных сымболях тут справа? А ў тым, што "левыя" здаюць сваі пазіцыі і губляюць прыхільнікаў, а раскол у іх шэрагах узлаваў іх, і яны вырашылі, паказаўшы зубы, прыцягнуць да сябе увагу грамадзкасьці? Дык маскоўскія падзеі гадавой даўнасьці паказалі, да чаго гэта даводзіць.

ШТО ГОД НАСТУПНЫ НАМ РЫХТУЕ?

Як паведаміў першы намесьнік Старшыні праўленьня Нацбанка М.Кузьміч, з 1-га студзеня 1995 года мяркуецца адмяніць абмежаваньне для юрыдычных асоб на абнаяўліваньне грошай з рублёвых рахункаў, якое дзейнічае зараз. На яго думку, гэта ненармальная з'ява, калі для наяўных грошай існуе адзін курс даляра, а для безнаяўных - другі. Па словах М.Кузьміча, супраць прыняцьця рашэньня выступае Міністэрства ўнутраных спраў, але Нацбанк зьбіраеца адстойваць сваю пазіцыю.

На думку экспертаў, магчымасьць безперашкоднага перавядзеньня "нал" у "безнал" і наадварот аблегчыць "адмываньне" грошай ценявымі і мафіёзнымі структурамі, але гэта меншае зло, чым існаваньне ў адной краіне, па сутнасьці двух валют - наяўнай і безнаяўнай.

* * *

Гандаль за валюту пасьля 1-га студзеня 1995 года будзе забаронены. Рашэньне аб гэтым нядаўна прыняў Нацбанк Беларусі. Усе валютныя секцыі крамаў будут весьці на гандаль за беларускія рублі. На думку кіраўніцтва банка, гэта павінна садзейнічаць умацаваньню курса нацыянальнай валюты.

Раней кіраўнік НБ РБ С.Багданкевіч заяўляў, што на руках у насельніцтва захоўваецца каля 1 млрд. даляраў.

* * *

Рэжым бязмытнага гандлю з Расеяй падоўжаны да новага года - аб гэтым заявіў міністр зьнешнеэканамічных сувязей М.Марыніч. Як вядома, Расейскі бок адмяніў мыта на гандаль з Беларусьсю ў чэрвені гэтага года, ў сувязі з падпісаньнем пагадненьня аб аб'яднаньні фінансавых сістэм краіны. Тэрмін дзеяньня бязмытнага рэжыма гандлю з Беларусьсю сканчыўся 1 кастрычніка. На мінулым тыдні М.Марыніч і віцэ-прэм'ер В.Кокараў адляталі ў Маскву, дзе вялі перамовы з расейскімі віцэ-прэм'ерамі А.Шохіным і С.Саскаўцом. У выніку было дасягнута пагадненьне аб падаўжэньні бязмытнага рэжыму яшчэ на 3 месяцы. Пытаньне аб рэжыме гандлю на 1995 год застаецца адкрытым. Беларускаму баку не ўдалося пераканаць расейцаў захаваць на будучы год клірынгавы тавараабмен паміж дзьвумя дзяржавамі.

СІМ

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

МЭТЫ І ЗАДАЧЫ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАРТЫІ

Беларуская нацыянальная партыя (БНП) - пераемніца нацыянальна-дэмакратычных і хрысьціянска-дэмакратычных традыцый, што існавалі на Беларусі перад прыходам сталінскага генацыду.

БНП узьнікла ў выніку якаснага пераўтварэньня Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі (НДПБ), перапрацоўкі яе ідэялагічных прынцыпаў. У выніку, была створана праграма БНП, якая захаваўшы шэраг ідэй НДПБ, нясе новы падыход да праблемы стварэньня і ўмацаваньня незалежнай беларускай дзяржавы, вываду яе з таго глыбокага крызісу, дзе яна апынулася ў выніку здрады ўрада Беларусі свайму народу.

БНП, з'яўляючыся антыкамуністычнай партыяй, тым не менш лічыць, што большасьць сучасных партый і рухаў, якія сябе называюць дэмакратычнымі, па сутнасьці, толькі псеўдадэмакратычныя. Яны ня здольныя паказаць беларускаму народу шлях да эўрапейскай дэмакратыі, дух бальшавізму яшчэ моцны ў гэтых арганізацыях. Таму БНП лічыць, што пра дэмакратыю як бліжэйшую мэту гаварыць яшчэ рана.

БНП прапануе іншы шлях - шлях кансалідацыі беларускага народа вакол нацыянальнай ідэі.

БНП - партыя кожнага беларуса. Але і грамадзянам іншых нацыянальнасьцяў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, усьведамленьне нацыянальнай ідэі адкрывае выразную перспектыву заняць сваё месца ў пабудове будучай дэмакратычнай і незалежнай Беларусі.

БНП, правая партыя хрысьціянска-дэмакратычнага накірунку, **абвяшчае наступныя мэты:**

БНП змагаецца за адраджэньне і развіцьцё беларускай нацыі, за тое, каб яна заняла сваё пачэснае месца сярод іншых народаў сьвету.

БНП - за адбудову незалежнай саборнай дзяржавы Беларусь, якую насяляе толькі адзін народ - беларускі, на гістарычнай тэрыторыі якога жылі і будуць жыць этнічныя групы: расейцы, палякі, украінцы, габрэі і іншыя.

Галоўныя прынцыпы:

1. Нацыяналізм, як лепшая духоўная якасьць асобы чалавека. Настаў час вярнуць гэтаму слову яго спрадвечны станоўчы сэнс. Нацыяналізм - гэта адданасьць сваёй нацыі, нацыяналізм - гэта змаганьне за волю і незалежнасьць, за яе духоўную і фізічную моц, за права нацыі быць роўнай сярод роўных.

2. Нацыянальная ідэя зьяўляецца для нас першараднай. Яна - самы галоўны з усіх чалавечых набыткаў у сферы грамадзкага жыцьця. Дэмакратычнае грамадзтва - гэта тая мэта, да якой павінен прыйсьці наш народ, і галоўным механізмам для дасягненьня яе зьяўляецца менавіта нацыянальная ідэя.

3. Ідэя нацыянальнай велічы Беларусі. Народ Беларусі павінен усьвядоміць сваю нацыянальную веліч і магутнасьць, як гэта было ў часы беларускай дзяржавы - Вялікага княства Літоўскага. Традыцыі ВКЛ павінны аднавіцца, а Беларусь павінна стаць адным з буйнейшых асяродкаў Эўрапейскай палітыкі.

4. БНП за абсалютную каштоўнасьць жыцьця, свабоду, самабытнасьць кожнага чалавека і кожнай нацыянальнасьці, што ёсьць на Беларусі.

5. Прыватная ўласнасьць - гэта аснова эканамічнай незалежнасьці, высокай эфектыўнасьці працы і палітычнай свабоды чалавека. Яна з'яўляецца недатыкальнай і сьвятой.

6. Нацыянальнае адраджэньне - з'яўляецца галоўнаяй часткай духоўнага адраджэньня.

БНП за адраджэньне і развіцьцё беларускай духоўнасьці на прынцыпах патрыятызму, традыцыяналізму, хрысьціянскай этыкі і маралі.

7. Канцэпцыя развіцьця Беларусі павінна складацца з паяднаньня нацыянальнага і дзяржаўнага элементаў. Дзяржаўная палітыка павінна грунтавацца на нацыянальных інтарэсах беларусаў.

Прынята на з'ездзе БНП летась у Менску.

ПРЭЗЫДЭНТА ЖАДАЮЦЬ ДАВЕСЬЦІ ДА ГАЛЕЧЫ

Генэральны дырэктар ВА "Бабруйскдрэў" У.Таранаў зьвярнуўся ў Вярхоўны Суд Беларусі з іскам аб абароне гонару і годнасьці да Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі і рэдакцыі газеты "Звязда". Справа ў тым, што 6-га ліпеня сёлета ў час "прамой лініі" з чытачамі "Звязды" тады яшчэ кандыдат у прэзыдэнты А.Лукашэнка назваў спадара Таранава злодзеем і патрабаваў вярнуць дзяржаве прысвоеную валюту. Праз тры месяцы абражаны гендырэктар, які лічыць сябе сумленным чалавекам, успомніў гэтую публікацыю і настойвае на тым, каб і Прэзыдэнт, і газета прынесьлі яму публічныя прабачэньні, а таксама выплацілі яму ў парадку кампенсацыі маральных стратаў 10 млн. рублёў. Аналагічны іск да А.Лукашэнкі і "Звязды" яшчэ з дапрэзыдэнцкіх часоў знаходзіцца ў Савецкім нарсудзе Менска. Экс-міністр абароны П.Казлоўскі таксама патрабуе ад прэзыдэнта прабачэньняў і выплаты 30 млн.рублёў.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ПАРТЫЯ - ЗА МОЦНУЮ ДЗЯРЖАВУ

Як паведаміў намесьнік старшыні Рэспубліканскай партыі А.Бадзілоўскі, РП выступае за моцную дзяржаву, якая абапіраецца на ўласныя сілы. "Ніхто не дапаможа нам, ні Захад, ні Ўсход, - лічыць спадар Бадзілоўскі. - Неабходна абапіраца на ўласную інтэлектуальную эліту." Па яго словах, сярод заснавальнікаў партыі шмат навукоўцаў і прадпрымальнікаў, але назваць канкрэтных бізнэсмэнаў ён адмовіўся. У партыю ўвайшлі, у асноўным, людзі сярэдняга ўзросту. Намесьнік старшыні РП таксама заявіў, што яго партыя зойме ў палітычным сьпектры Беларусі цэнтрысцкі стан. Па яго словах, на момант рэгістрацыі ў траўні бягучага года ў партыі было 120 чалавек, а да канца года колькасьць членаў партыі павялічыцца да тысячы.

ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧЫ АКАЗАЎСЯ ПРАВЫ

Былы міністр абароны Беларусі П.Казлоўскі, паніжаны ў званьні А.Лукашэнкам, і тры яго намесьнікі - Зуеў, Дзямідзік і Сікора - звольненыя са сваіх пасад, зьвярнуліся ў камісію ВС па пытаньнях абароны і нацыянальнай бясьпекі з прозьбай абскардзіць адпаведныя прэзыдэнцкія ўказы ў Канстытуцыйным судзе. Аднак, парламенцкая камісія не стала зьвяртацца ў КС, бо, па заключэньню юрыдычнага аддзела ВС, А.Лукашэнка, які з'яўляецца Галоўнакамандуючым узброеных сіл Беларусі, дзейнічаў у рамках сваёй кампетэнцыі і не парушыў ні Канстытуцыі рэспублікі, ні іншых законаў.

ПРЭЗЫДЭНЦКАЙ ПАРТЫІ НЯ БУДЗЕ

Глава Адміністрацыі прэзыдэнта Л.Сініцын адхіліў заяву старшыні партыі Ўсебеларускага адзінства і згоды М.Шэляговіча ў тым, што ЎАПЗ будзе прэзыдэнцкай партыяй. Па словах спадара Сініцына, Прэзыдэнт будзе "над партыямі" і ня будзе аддаваць перавагу ні адной з іх. Глава Адміністрацыі зазначыў, што аб гэтым было прама сказана М.Шэляговічу падчас нядаўняй сустрэчы Прэзыдэнта з дэлегацыяй Партыі расейскага адзінства і згоды, на якой прысутнічаў лідэр УАПЗ.

СІМ.

У МАСКВЕ АДНАЎЛЯЮЦЬ «КРАСНОЕ КРЫЛЬЦО». НА БЕЛАРУСІ ІРВУЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫ ШТАНДАР

Тэлестудыя "Астанкіна" шырока асьветліла рэстаўрацыі і адкрыцьцё "Красного крыльца" Маскоўскага Крамля. Расейскае дзяржаўнае тэлебачаньне ахвотна выкарыстоўвае ў сваіх перадачах песьні, выставы жывапісу, кінафесты́валі, дзе прэвалюе патрыятызм. Усё гэта разам успрымаецца расіянамі як патрэбнае, бо менавіта такія праграмы ўздымаюць дух нацыі, гуртуюць яе.

У нас жа на Беларусі - зусім адваротнае. Як толькі дзе загучала патрабаваньне пра беларушчыну, адразу ж верашчаць славянскія саборы ды гэтак званыя народныя рухі: нацыяналісты, а то і зусім фашысты. Больш хітрыя ў шэрагах гэтых рухаў дзейнічаюць "исскуснее", чым апантаныя ідэяй братняга саюзу ўсіх славянскіх народаў вышэйзгаданыя арганізацыі. Перакідаюць цяжкае эканамічнае становішча нашай дзяржавы ў супрацьвагу адраджэньню на зямлі Беларусі дарагой майму сэрцу мінуўшчыны. Адна з такіх спробаў была нядаўна зьдзяйсьнёна ў Горадні дэпутатам гарсавету Гірасам. Ах як выпінаўся гэты дэпутат у сваім артыкуле ў "Гродзенскай праўдзе", што трэба вырашаць набалелыя эканамічныя пытаньні, а не траціць час на наданьне вуліцам абласнога цэнтру гістарычных назоваў. Паўстае пытаньне, а дзе ж быў увесь час свайго дэпутацтва шаноўны дэпутат? Чаму не вырашаў эканамічных пытаньняў? Скажаце - ня меў сілы? Да народа трэба было зьвяртацца, як робіць гэта БНФ ды іншыя дэмакратычныя арганізацыі. Не зрабіў гэтага - сядзі і чакай, калі скончыцца твой тэрмін народнага абраньніка. Ня лі сьлёзаў кракадзіла і не пярэч тым дэпутатам, якія мэтанакіравана вось ужо чатыры гады робяць так патрэбную адраджэньню беларускай дзяржаўнасьці справу вяртаньня гістарычнай справядлівасьці. Можа, каб усе дэпутаты ў свой час зразумелі гэтую гістарычную неабходнасьць і падчас адной сесіі вырашылі справу з дзяржаўнымі сымболямі, перайменаваньнямі "запазычаных" тапанімаў, то хапіла б ды яшчэ і зьвярхом часу, каб недапусьціць дзяржаву да такога крызісу. Усходняя прымаўка згадвае: позна піць нарзан, калі ныркі адваліліся. На Беларусі пакуль што народнае выслоўе зразумелі далёка ня ўсе.

Спадар.

У «АЧЫШЧЭНЬНІ» РАСКОЛ

Зрабіўшы некалькі паходаў па гарадзенскіх крамах, мясцовыя ачышчэнцы палічылі, што зрабілі значную дапамогу Прэзыдэнту і яго каманьдзе. Аб чым пасьпяшалі давесьці сталічнаму начальству.

На жаль, паходы па крамах і рапарты да Менску не задаволілі самую рэакцыйную частку членаў "Ачышчэньня". Таму, на нядаўнім паседжаньні ачышчэнцаў адбыўся раскол. Адны - за дапамогу Прэзыдэнту А.Р.Лукашэнка, другія - за аднаўленьне СССР і ўхваленьне ЦК КПСС.

Г.В.

ЖЫВІ, БЕЛАРУСЬ!

Народ у зале ўвесь гудзе,
Што гэта? Сесія ідзе.
Прамоўцы выступаць гатовы,
Свае ўносяць прапановы.
Паслухаць іх, ну проста сьмех!
Як ім ня сорам, як ня грэх.
Так гвалтаваць Радзіму-маці,
Адзін другога папракаці,
Якая мова быць павінна
У нас галоўнай на Радзіме.
Яны гатовы здрадзіць, схлусіць
Любімай нашай Беларусі,
Яе ў калонію прадаць,
Сябе героямі назваць.
І толькі будзе той харошы,
Хто хоча мець чужыя грошы.
Дзівіся, беларускі люд,
Які яны зрабілі цуд.
Не дачакаемся ніяк,
Калі ўжо выступіць Пазьняк.
Заўсёды слухаць мы гатовы
Яго разумныя прамовы.
Калі ў мяне спытае хтосьці,
То я скажу ім, ягамосьці,
Зянон Пазьняк, ён не такоўскі,
А як Кастусь той Каліноўскі!

Ніна ЯРМАЛІНСКАЯ,
выхавацель д/садка N 25, г.Салігорск.



... І СЬНЯЦЦА СНЫ АБ БЕЛАРУСІ.

ДА 55-Х УГОДКАЎ ЗАХОПУ ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

У гэтым годзе споўнілася 55 гадоў з таго часу, як 17 верасьня 1939 года Чырвоная Армія ўступіла на землі Заходняй Беларусі. З гэтай нагоды хочацца ўспомніць падзеі тых часоў, сьведкам якіх давялося быць. Пасьля развала СССР ў 1991 годзе падзеі 17 верасьня 1939 года чамусьці сталі рэдка ўспамінацца. Са старонак газет зьніклі артыкулы, у якіх паказвалася, якім вельмі "добрым" было далучэньне Заходняй Беларусі да БССР.

Па змове Сталіна з Гітлерам аб падзеле Польшчы, заключэнні паміж імі сакрэтных дагавораў аб падзеле міру (сфераў уплыву), 1 верасьня немцы напалі на Польшчу. Пачалася Другая сусьветная вайна. Польская армія, у шэрагах якой было шмат беларусаў, гераічна абаранялася, але не магла супрацьстаяць нямецкай навале. Вайна ішла на захадзе Польшчы, а на ўсходзе было ўсё спакойна. І вось нечакана, 17 верасьня, здаецца, гэта была нядзеля, дзесьці каля 10-11 гадзін дня людзі ўбачылі на дарогах савецкія танкі, якія ішлі на захад. Праехаўшы вёску, калона спынілася на полі каля дарогі. З танкаў вылазілі танкісты ў шлемах і чорных камбінезонах. Людзі моўчкі глядзелі на танкі і на танкістаў. Некаторыя пачыналі гаварыць з імі, але тыя чамусьці неахвотна адказвалі і стараліся пазьбягаць кантактаў з насельніцтвам. Толькі некаторыя з іх (потым стала вядома, што гэта былі палітрукі) пачыналі гаварыць, што Чырвоная Армія прыйшла, каб вызваліць Заходнюю Беларусь, што Савецкая ўлада прынясе яе народу шчасьце і дабрабыт, што цяпер усё народнае, памешчыкам і капіталістам цяпер ня месца на Беларусі. Зямлю і маёмасьць ад памешчыкаў трэба забіраць.

Знайшліся ахвочыя пажывіцца чужым. Гэта былі, у асноўным, лайдакі, гаспадары, якія ленаваліся працаваць на сваіх гаспадарках, ахвочыя ўзяць чужое, калі з'яўлялася такая магчымасьць. Але такіх людзей было ня шмат. Яны пайшлі па дварах (маёнтках) і пачалі разьбіраць галанцкія сыры, што выраблялі ся з малака ў двары, скрыні з яблыкамі, разьбіраць мэблю з палацаў. Забіралі кароў і рэзалі на мяса. Адзін з "аматараў паншчыны" прывез з палаца вялікае люстэрка і паставіў яго ў хляве. Аднойчы карова, убачыўшы ў люстэрка сваё адлюстраваньне, пайшла на яго "ў атаку" і рагамі разбіла яго.

Гаспадаркі паноў былі разрабаваны і змарнаваны, а маглі б быць выкарыстаны з вялікім прыбыткам.

Праз дзень ці два пасьля з'яўленьня танкаў Савецкай Арміі, з'явіліся калоны пяхоты з абозамі. Салдаты вялі за вяроўкі коней. У іх хвастах былі пазавязаны біркі. Коні былі без вуздзечак, выгляд іх быў "марны". Коні з вазамі выглядалі лепей, гэта адразу кідалася ў вочы. На пытаньні, чаму яны такія худыя, жаўнеры маўчалі альбо нехаця адказвалі, што гэта ня іхія коні, а калгасныя. Для нас гэта было дзіўным. Своеасаблівае было ў жаўнераў уяўленьне аб памешчыках. Памятаю, як бацька прыйшоў да хаты і гаварыў са сьмехам, што паны на нас аралі? На што бацька адказаў: "Скуль вы ўзялі такое глупства?" Жаўнер адказаў: "Нам так гаварылі."

Адзін з афіцэраў зайшоў на танцы і, убачыўшы дзьвюх дзяўчын модна апранутымі ў капялюшах, усклікнуў: "О, і паны ў вас на танцы ходзяць!" І калі яму сказалі, што гэта не паны а прыслуга са двара, "апраўдваўся". Мабыць, так і пайшоў не павер ыўшы. Назаўтра ў вёсцы са сьмехам казалі, што Саветы прымаюць панскіх слуг за паноў.

Восеньню, калі ўсталявалася Савецкая ўлада, адбыліся выбары дэпутатаў у Народны Сход, які павінен быў прасіць улады аб далучэньні Заходняй Беларусі да БССР (быццам яна ўжо не была далучана). На справе гэта былі не выбары - нейкая гульня, бо выбіраць не было каго і чаго. Адзін кандыдат быў ужо наперад выбраны, дакладней, назначаны. Галасаваць павінны былі ўсе. Выбарамі кіраваў на выбарчым участку нейкі энкэвэдыст. Памятаю, упершыню я ўбачыў прадстаўніка Савецкай улады ў сініх портках, ботах і падпаразаны поясам кашулі. І калі яму сказалі, што адмаўляецца галасаваць адзін чалавек - амерыканец, той вельмі разьлаваўся і некалькі разоў пасылаў за ім, але той так і не пайшоў галасаваць. "Гэтым амерыканцам" быў доктар, які прыехаў на стажыроўку ў Польшчу і яго засьпела вайна. Яго потым чамусьці ніхто не арыштаваў і не чапаў, і нават не вывозіў.

Восеньню былі адкрыты школы. Вучоба пачалася на беларускай мове, але настаўнікаў не хапала, старыя кудысьці зьніклі. Казалі, што іх арыштоўваюць і "адпраўляюць". Таму і пачынаў вучыць дзяцей невядома хто. Да прыхода Чырвонай Арміі крамы былі поўныя ўсякіх тавараў. Цераз месяц яны апусьцелі. У вёсках былі адкрыты крамы. Але туды акрамя таннай гарэлкі і цукерак "падушачак" і "гарошка" нічога не прывозілі. Танную гарэлку пачалі купляць, бо было чым закусваць. Так новая ўлада пачала спойваць народ. Пры Польшчы ж гарэлка была дарагая і яе амаль ня пілі, а з прыходам Саветаў народ пачаў прызвычайвацца піць.

У 1941 годзе часам у краму пачалі завозіць крыху паркалю. Чамусьці ўсе ведалі, што заўтра штосьці прывязуць. Чаргу займалі з трох гадзін ночы, прыходзіла амаль уся вёска.

Убачыўшы Савецкую ўладу не па расказах, а на свае вочы, у жыцьці, нават яе прыхільнікі сталі яе ворагамі.

Антон ДУДАР.

«КРАДЗІ, ІГНАСЬ, ПАКУЛЬ САВЕЦКАЯ ЎЛАСЬЦЬ», Альбо жменька нататак пра калгасны статак

Іван Мечыслававіч Бабкевіч прыйшоў на пасаду старшыні калгасу "Будслаўскі" Мядзельскага раёну разам з подыхам гарбачоўскага ветрыку перабудовы, разам з ідэяй сацыялізма з чалавечым тварам. Новы старшыня адразу ж пачаў ажыцьцяўляць названую ідэю шляхам зьвіваньня ўласнага, так бы мовіць, гнязьдзечка ў выглядзе салідненькага такога дамочку для больш чым сьціплай (колькасна) сваёй сямейкі. Адначасова, каб забясьпечыць бесперашкоднае пранікненьне новых павеяў часу, Мечыслававіч убухаў неслабыя калгасныя грошыкі ў меліярацыю і раскарчоўку тых кусточкаў, якія не пасьпелі зьнішчыць пры былым старшыні. Змагары з ландшафтам зрабілі сваю справу. Толькі новыя пасяўныя плошчы не дапамаглі калгасным кароўкам: з-за дрэннага стойлавага ўтрыманьня яны пачалі дохнуць. Так былі зачынены малочнатаварныя фермы ў вёсках Казіміраўка і Яцкавічы. Разам з тым, пад маркай "падзяжу" скаціны, на адкормачным комплексе в.Палесьсе пусьцілі пад нож і здаровых бычкоў. Здарыліся "ураджайныя" дні, калі "здыхала" адразу некалькі галоў.

"Мясная" была эпоха - пачатак 90-х.

А нядаўна здарылася дужа непрыемная для старшыні і яго праўленцаў неспадзяванка.

Ноччу з 14-га на 15-га сакавіка гэтага году на зерняскладзе в.Равячкі Будслаўскага с/с няўлічаным, г.зн. украдзеным, сьпісаным пад выглядам усушкі ды ўтрускі, збожжам каманда "перадавых" калгасьнікаў загружала "левы" транспарт-ны сродак. Кіраваў аперацыяй галоўны аграном гаспадаркі Гапанёнак. Дапамагалі яму ў такой нервовай справе: кладаўшчыца Ірэна Сіняўская (прыстроена была на адказны пост замест Чаславы Сіняўскай, кладаўшчыцы з 15-гадовым стажам, якая не пажадала ўдзельнічаць у калектыўным раскраданьні калектыўнага дабра); кладаўшчыца Данута Рагоўская; калгасны касір Пятро Хацяновіч, ён жа - былы камсамольскі важак калгасьнікаў, былы прафсаюзны правадыр і... былы касір. Бо накрылі слаўныя савецкія ворганы слаўных савецкіх калгасьнікаў, як той казаў, на гарачым. Эх, цёмная ты ночка!..

Калі загружаную машыну зважылі, аказалася ў ёй каля 14 тон "усушанага" дабра.

Днём, 15-га, у раён былі выкліканы члены праўленьня к-са "Будслаўскі", з удзелам якіх і адбыліся перавыбары старшыні. Галоўнага аграномa пасадзілі адразу ж. Кладаўшчыц і касіра паздымалі з работы. Сядзяць яны пакуль што па хатках, чакаюць вынікаў сьледзтва. Чакае і наш Іван Мечыслававіч, згадваючы, відаць, сваю нялёгкую кар'еру старшынёўства.

На зьмену "пацярпеламу" прыйшоў Анатоль Мар'янавіч, сын Мар'яна Браніслававіча Вайнілкі, колішняга дырэктара саўгасу "Будслаўскі", а цяпер - дырэктара Ілаўскага дома-інтэрнату. Кажуць, малады старшыня робіць чыстку канторскага апарату, наводзіць парадак, закупляе маладняк для дойнага статку. Пагаворваюць, што новаму суседу спрыяе ксёндз Будслаўскага касьцёлу бернардынаў, спадзяючыся такім чынам вярнуць касьцельны будынак, заняты цяпер калгаснай канторай.

Перасаджаны новым старшынёю з брыгадзірства ў галоўныя аграномы Язэп Сяліцкі ўжо атрымаў пару спагнаньняў за п'янства. Гэта ж самы зух, спальваючы сухую канюшыну, якая засталася летась няскошанай на дзесятках гектараў тых самых меліяраваных земляў, ледзьве не пусьціў дымам жылы хутар. Толькі прысутнасьць гаспадара папярэдзіла няшчасьце.

Застаўся на сваёй ранейшай пасадзе намесьніка старшыні спадар Пятроўскі, таксама сьпецыяліст яшчэ той.

Вось і ўздымаюцца заканамерныя пытаньні: а ці зьменіцца што са зьменаю старшыні? Ці не пачнецца ўсё спачатку, паводле прымаўкі: "Крадзі, Ігнась, пакуль савецкая ўласьць?" Баюся, што так яно і будзе. І будуць доўжыцца раённыя будні, пакуль пануе на нашай зямлі ўлада саветаў і ейныя дзеткі - саўгасы з калгасамі.

Зьдзіслаў РЭМ

P.S. З моманту пісаньня гэтага матэрыялу прыйшло пяць месяцаў. Стала вядома, што герою нашай нататкі галоўнаму аграному Гапанёнку далі шэсьць гадоў зьняволеньня. Астатнія ўдзельнікі калгасных рабункаў выйшлі сухімі з вады. Больш таго, былая кладаўшчыца І.Сіняўская зноў займае "адказную" пасаду - прымае малако ад вяскоўцаў. І прымае з уласьцівым ёй спрытам. Так што некаторыя здатчыкі вырашаюць: лепей тым малаком сваё сьвінства карміць, чым суседава. Так і жывем.

«НАША СТАЛІЦА - МАСКВА»?

"Радзіма - гэта краіна, дзе ты нарадзіўся. Гэта краіна тваіх бацькоў і дзядоў, Айчына твая.

Наша Радзіма - СССР, Саюз Савецкіх Сацыялістычных рэспублік..." - чытае ўслых сынок-другакласьнік.

- Што за бязглузьдзіцу ты нясеш? - зьдзіўлена пытаюся я.

- Не бязглузьдзіца гэта, а тэкст са школьнага падручніка, - з гонарам адказвае малы, успрымаючы інфармацыю з падручніка як ісьціну.

- Тут яшчэ напісана, што ў нашага сьцяга чырвоны колер... І пра герб... І пра тое, што Масква - сталіца нашай Радзімы...

- У якой жа гэта кнізе? - пытаюся.

Адказ:

- У падручніку "Азнаямленьне з навакольным сьветам".

... Так беларускія дзеткі знаёмяцца з навакольным сьветам. І дапамагае ім у гэтым вучэбны дапаможнік В.М.Мінаевай і В.Ф.Лук'яненка "Пазнаю свет". Раздзел "Родная краіна, родная рэспубліка" вельмі эмацыянальна расказвае школьнікам пра Канстытуцыю СССР, правадыра бальшавікоў Леніна, утварэньне "самай справядлівай у сьвеце савецкай рабоча-сялянскай рэспублікі", пра герб з сярпом і молатам, пра Красную плошчу...

"Горад Масква даўно стаў цэнтрам і сэрцам Айчыны. Тут працуе Прэзыдэнт СССР, Вярхоўны Савет, Савецкі ўрад. Вось чаму Масква па праву называецца сталіцай нашай Радзімы..."

Нядрэнная інфармацыя для дзіцячых мазгоў, ці не так?

У нас заўсёды эканомілі на дзецях, хоць і крычалі, што менавіта ім - усё лепшае. Вось вам і яшчэ адзін красамоўны прыклад! Чатыры гады прыйшло з таго часу, як Беларусь абвешчана незалежнай дзяржавай. Даўно зьмяніліся гістарычныя каштоўнасьці, сталі звыклымі новы герб і сьцяг. Толькі ў школьных падручніках усё засталося па-ранейшаму...

Дарослым не да дзяцей (свае б праблемы вырашыць!). А між тым, усе разумеюць, што з дзяцінства пачынаецца фармаваньне сьветапогляду і закладваньне маральных асноў, пачуцьця нацыянальнай самасьвядомасьці і годнасьці чалавека.

Няўжо за тры гады, якія прайшлі з дня выпуску падручніка, не знайшлося сродкаў на выпуск новага? Няўжо, эканомячы на малым, разумныя дзядзькі не разумеюць, што губляюць намнога большае - дзіцячы давер. Ніякія страты на выданьне новага вучэбнага дапаможніка не змогуць параўнацца з тым уронам, які наносяць дзіцячай сьвядомасьці старыя дэзінфармуючыя падручнікі (нават калі ў іх не вывучаць ці заклейваць цэлыя раздзелы).

Не хачу, каб мой сын, любімай кнігай якога з'яўляецца дзіцячая Біблія, дэкламаваў са свайго падручніка:

"Кастрычнік у мяне ўвайшоў настолькі,
Што ён маім жыцьцём навекі стаў!"

Няхай яму дапамогуць спазнаць сьвет творы Ў.Караткевіча, А.Адамовіча, В.Быкава, Л.Дайнекі, вершы М.Багдановіча, Ф.Багушэвіча, Л.Геніюш, А.Пашкевіч...

Алёна БІБІКАВА,
маці сына-другакласьніка.

СУМЕЖЖА

ПОЛЬСКАЯ ПАЛІЦЫЯ БЯССІЛЬНА СУПРАЦЬ РАСЕЙСКАГА РЭКЕТУ

"Ці ведаеце вы пра парадак у Варшаве? Тут шмат кішэньнікаў і злачынцаў іншага толку, таму вы павінны заплаціць нам, а за гэта мы скажам вам пароль, які гарантуе бясьпеку ў сталіцы Польшчы", - так гаварыў у кавярні ў цэнтры Варшавы рослы юнак. Справа была апоўдні. Некалькі яго "калег" стаялі ля ўвахода і чакалі вынікаў размовы.

Турыстаў ня цяжка пазнаць у любым горадзе. Напэўна, таму рускія рэкеціры, каб пераканацца ў слушнасьці сваіх назіраньняў, па-польску спыталі ў летувісаў, якія сядзелі ў кавярні, які час. Пасьля кароткай гутаркі стала зразумела, што лепей не таіць, колькі грошай у кашальку, інакш "прафесійны злодзей і яго калегі зробяць усё". Пры гэтым яны ветліва растлумачылі, што чым большая сума, тым менш трэба плаціць. Калі адзін з летувісаў, які меў даволі шмат грошай, пачаў паказваць непакой і сьцьвярджаць, што ў кашальку ўсяго некалькі даляраў, рэкецір засумняваўся ў яго сумленнасьці. Але параіўшыся і вырашыўшы, што мы - "дробная рыбінка", рэкеціры адыйшлі. У Варшаве, напэўна, толькі ў двух месцах прыезжыя з былога СССР могуць адчуваць сябе ў бясьпецы - гэта Міжнародны аэрапорт і Стары горад. У аэрапорце шмат супрацоўнікаў сьпецслужбаў, а ў Старым горадзе, дзе з-за польскіх рэкеціраў нядаўна баставалі кавярні, рэстараны і крамы, зараз масава патрулююць паліцыянты і жаўнеры. У іншых месцах, дзе нярэдка бываюць турысты і гандляры з Усхода (чыгуначны вакзал, рынак, цэнтр горада) напад, абрабаваньне ці зьбіеньне - справа цалкам верагодная.

Больш за ўсё злачынстваў зьдзяйсьняецца на рынку, які знаходзіцца на адным з буйнейшых стадыёнаў. Невысокія цэны вабяць сюды гандляроў ня толькі з былога СССР, але і з Чэхіі, Славакіі, Уетнама, Лаоса. Па словах паліцыянтаў, тут валоданьні рускамоўнай мафіі. Яна не абмяжоўваецца толькі зборам "даніны", але і выкрадане кайстры з рэчамі, пашпарты і грошы, забівае людзей.

Вось апошняя скандальная гісторыя. 23-гадовая жыхарка Беларусі, прадаўшы тавар, цешылася: за дзень зарабіла столькі, што на месяц усёй сям'і хопіць. Хтосьці ёй параіў не везьці дамоў грошы, а купіць тавар, прадаць яго і на гэтым прыбытак яшчэ падвоіць. Надзея на ўзбагачэньне абвалілася, як толькі яна напхала дзьве кайстры сьвітэрамі: дзяўчыну пабілі, адабралі тавар і пашпарт. Адна кіяўлянка стала супакойваць і параіла зьвярнуцца да нейкага Валодзі, той, нібыта, дапаможа.

Валодзя адвёў пацярпелую ў кавярню побач са стадыёнам, накарміў абедам, даў 100 даляраў і прапанаваў тыдзень пабыць... прастытуткай. Заробак 150 даляраў штодня.

Тая пагадзілася. Яе павялі да аўтобуса "Ікарус", вокны якога закрывалі цёмныя фіранкі, у салоне замест сядзеньняў стаялі некалькі кушэтак і вядро халоднай вады. У першы дзень прыезжая "абслугавала" 13 гандляроў з Сярэдняй Азіі і Каўказа. На наступны дзень яна запатрабавала аплаты, але была пабіта. Яе павезьлі за горад і кінулі ў лесе.

Консул Летувы ў Варшаве Вальдас Ластаўскас гаворыць, што ахвярамі і кішэньнікаў, і іншых злачынцаў становяцца ня толькі гандляры. У консульства зьвярнуліся нават летувіскія паліцыянты і дэлегацыя аднаго міністэрства, пасьля абрабаваньня на чыгуначным вакзале. Па словах В.Ластаўскаса, ён не адважваецца назваць дакладную колькасьць пацярпелых суайчыньнікаў, бо ў консульства звычайна зьвяртаюцца наконт зьнікненьня пашпартаў. Сёлета выдадзена ўжо 200 часовых дакументаў. Консул гаворыць, што вельмі часта нападу падвяргаюцца расейцы, беларусы, летувісы, якія прыехалі ў Польшчу. У пасольства Украіны, якое знаходзіцца побач з пасольствам Летувы, кожную раніцу выстройваецца чарга пацярпелых.

У раскрыцьці рабункаў і крадзяжоў польская паліцыя амаль бяссільная, бо без прад'яўленьня абвінавачаньня падазроных можна затрымаць толькі на 48 гадзін. А сьведкі ў гэты час на радзіме ці на шляху туды.

Польская паліцыя пакуль не знаходзіць дзейсных мер у барацьбе нават з дробнымі злачынцамі з Усхода.

Іншы раз ініцыятыву бяруць на сябе палітыкі: радыкальныя партыі Польшчы зарганізавалі некалькі пікетаў пратэсту - на чыгуначных станцыях яны сустракалі цягнікі з Усходу. Ужо раздаюцца патрабаваньні адгарадзіцца ад суседзяў новай "бярлінскай сьцяной".

LR

ВЕСТКІ З ПОЛЬШЧЫ

"Эканамічны камітэт рады мейскай" адобрыў праэкт урадавай праграмы разьвіцьця гаспадарчых сувязяў з Усходнімі краінамі. Мэта праграмы - перапыненьне застою ў гандлю з новымі суверэннымі дзяржавамі.

Прэарытэты ў гандлі атрымаюць з 15 былых рэспублік СССР найперш: Беларусь, Эстонія, Летува, Латвія, Расея, Украіна, Туркменія, Казахстан і Ўзбекістан.

* * *

У Крыніцы Гурскай адбыўся эканамічны форум Польшча-Усход, на якім разгледжаны магчымасьці эканамічнай інтэграцыі польскіх сельскагаспадарчых фірмаў з краінамі СНД.

У працы форуму ўзялі ўдзел прадстаўнікі саюза польскіх бізнэсмэнаў і віцэ-прэм'ер Анджэй Рахоўскі.

* * *

У Беластоку новы ваявода. Ім стаў Анджэй Гаеўскі, які дагэтуль выконваў абавязкі віцэ-ваяводы.

Віцэ-ваяводам абраны Гжэгож Рыхоўскі.

ВІЛЕНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Па запрашэньню Ўзброеных Сіл Даніі краіну наведалі прадстаўнікі міністэрстваў абароны Летувы, Латвіі і Эстоніі. Гаспадары прапанавалі ім выбраць амуніцыю, якая ўжо не выкарыстоўваецца, транспартныя сродкі. Прадстаўнікі краін Балтыі ў першую чаргу зацікавіліся "джыпамі" вытворчасьці ЗША, а таксама радыёстанцыямі, выраблены мі ў 1960 годзе.

* * *

Згодна праведзенаму ў посткамуністычных краінах Усходняй Эўропы апытаньню, 90 працэнтаў летувісаў адчуваюць сябе вольнымі людзьмі. Цікава, што 80 працэнтаў рускіх, што жывуць у Летуве, таксама сябе так адчуваюць.

* * *

Зараз у Летуве існуе прыкладна 3500 сумесных прадпрыемстваў і прадпрыемстваў замежнага капіталу. Іх статутны капітал дасягае 500 мільёнаў літаў. Але чым яны займаюцца - сказаць цяжка. Больш СП (912) створана з Расеяй, з Нямеччынай - 567, з Польшчай - 559, з ЗША - 222.

* * *

Сусьветна вядомая гатэльная кампанія "Інтэр-Кантынэнталь" цікавіцца віленскім гатэлем "Летува". Віцэ-прэзыдэнт кампаніі Т.Міклебуст паўторна наведаў рэспубліку наконт ўключэньня яго ў сетку гатэляў "Інтэр-Кантынэнталь" і атрымаў ад Міністэрства гандлю і прамысловасьці краіны прапанову набыць гатэль у цэнтры Вільні.

* * *

У Вільні асьвечаны касьцёл Сьвятога Франьцішка былога бернардынскага кляштара. Пасьля таго, як прайшлі дзесяцігоддзі, тут зноў была адслужана сьвятая імша.

* * *

Жыхары Шаўляя, якія жывуць і працуюць у цэнтральнай частцы горада, змогуць хутка зьвяраць час па гадзіньніку на вежы самакіраваньня. Кожныя паўгадзіны ён будзе адбіваць самы дакладны час у Летуве.

* * *

У Коўні прайшоў міжнародны кірмаш "Poleksport Kaunas-94". У ім прынялі ўдзел каля 200 фірмаў Польшчы, якія ў асноўным вырабляюць тавары паўсядзённага попыту і прадукты харчаваньня.

* * *

У шосты раз сёлета Друскенікская гарадзкая ўправа ў парадку выключэньня дазволіла 17-гадовай дзяўчыне ўступіць у шлюб. Яшчэ тры непаўнагадовыя сталі маці, так і не дачакаўшыся прапановы выйсьці замуж. Але гэта выключэньне. Сярэдні ўзрост друскенікскіх нявест складае 20-24 гады, жаніхоў - 22-24 гады. Па анкетах, пераважная большасьць з іх - беспрацоўныя, але пашпарты жаніхоў ушпіляны візамі.

МГ-ЛР

ЛЕТУВІСЫ ШТРАФАМІ ЗЬДЗІЎЛЯЮЦЬ УСЮ ЭЎРОПУ

З Польшчы вярнуліся галоўны камісар дарожнай паліцыі Летувы Р.Алека і камісар аддзела патрульнай службы дарожнай паліцыі В.Йонікас. Р.Алека даў інтэрв'ю "Летувос ритас".

- Якой была мэта вашай паездкі ў Польшчу?

- Нашы суседзі ўжо сем год запар выбіраюць лепшага дарожнага паліцыянта. У гарадку Легіёнава, што пад Варшавай, знаходзіцца буйны вучэбны цэнтр, куды з усяе Польшчы з'ехаліся 80 лепшых дарожных паліцыянтаў, з іх ліку і быў абраны самы лепшы. Зьдзівіла вялікая ўвага грамадзкасьці да гэтага мерапрыемства. Прысутнічалі многія работнікі тэлебачаньня, журналісты, віцэ-прэм'ер Польшчы, кіраўніцтва паліцыі, прэзыдэнты страхавых фірм, высокастаўленыя службовыя асобы Міністэрства шляхоў зносін... Кіраўнік дарожнай паліцыі запрасіў шмат ганаровых гасьцей, павінны былі прыехаць кіраўнікі дарожнай паліцыі ўсіх суседніх краін, але прадстаўнікоў Чэхіі, Славакіі і Расеі не было. А шкада, таму што з расейскімі калегамі мы яшчэ падтрымліваем сувязі, а вось з чэхамі і славакамі кантактаў няма.

Прыехалі госьці з Беларусі, Украіны, Нямеччыны, праўда, не такога высокага рангу, як чакалася. Мы гаварылі пра асаблівасьці дарожнага руху ў кожнай краіне, аўтамабільных крадзяжах, абмеркавалі актуальныя пытаньні. М.Папала прапанаваў зноў сустрэцца ў Варшаве ў траўні наступнага года.

- Ці не зьдзівілі палякаў памеры штрафаў за парушэньне правіл дарожнага руху ў Летуве?

- Зьдзівілі, і ня толькі палякаў. Уражаны былі ўсе, але больш іншых, мабыць, украінцы і беларусы - у іх памер падобных штрафаў складае ў сярэднім 3 даляры ЗША. Калі мы сказалі, што ў нас лік ідзе на тысячы даляраў, яны ўвогуле страцілі мову... Нас пыталі, чаму мы такія жорсткія. Жорсткія ня мы, а жыцьцё. Ці цяжка прышпіліць рамень бясьпекі? Секунда - і ўсё. А за невыкананьне гэтага патрабаваньня даводзіцца плаціць 25 літаў...

- У Летуве штрафы вышэйшыя, чым у Польшчы?

- Шчыра кажучы, канкрэтных памераў штрафаў у Польшчы я ня ведаю. Але ў нас штрафы за парушэньні на дарогах адны з самых высокіх у Эўропе. Нават у Нямеччыне некаторыя з іх ніжэй.

- Ці ішла размова аб аўтамабільных крадзяжах?

- Шырока гэта тэма не абмяркоўвалася, мы толькі абмяняліся інфармацыяй. Але як у Польшчы, так і ў Нямеччыне ня вельмі ўнікаюць у гэтыя справы - гэта сфера дзейнасьці страхавых кампаній Польшчы - "Ватра" і PZU. Іх зьдзіўляе ня толькі адсутнасьць парадка ў нашай сістэме страхаваньня як такой.

Неабходна стварыць сістэму, пры якой скрадзеныя аўтамабілі нельга было б ні купіць, ні зарэгістраваць, і не мае значэньня, праз колькі рук гэтыя аўтамабілі пройдуць.

- Нямецкія паліцыянты таксама абыякавыя да гэтай праблемы?

- Так, нават у большай ступені, чым палякі.

- Што было, на ваш погляд, самым цікавым на конкурсе ў Польшчы? Які клас ваджэньня ў польскіх патрулёў?

- Спаборніцтвы па фігурнаму ваджэньню вялікага ўражаньня не выклікалі - фігуры былі размешчаны даволі прымітыўна. Падобныя конкурсы ў нас ацэньваюцца стражэй. У спаборніцтвах на матацыклах заданьні былі больш простымі, чым у нас. Нашы міліцыянты не саступаюць калегам з Польшчы.

Мне спадабаліся польскія рэгуліроўшчыкі. Прываблівае пластыка, дакладнасьць рухаў - адразу бачна добрая трэніроўка.

ХТО ВЫРАТУЕ БЕЛАВЕЖСКУЮ ПУШЧУ?

Белавежская пушча гіне на нашых вачах. На думку польскіх спецыялістаў, што не адзін год назіраюць за гвалтоўнымі зьменамі ў нетрах пушчы, галоўнай прычынай заняпаду зьяўляецца прысутнасьць на яе тэрыторыі прадпрыемстваў па перапрацоўцы драўніны.

І хоць апошнім часам вырубка дрэў тут значна панізілася, гэта не выратоўвае становішча. Пушча хворая. Бязлітаснае выкарыстаньне драўніны, паляваньні на зьвярыну і птацтва парушыла дзісбаланс. Пушча чакае паратунку. Закон, які з 20-х гадоў ахоўвае Белавежскую пушчу на тэрыторыі Польшчы, як нацыянальны парк, страціў надзённасьць. Яго лёгка абыходзяць чыноўнікі самых розных узроўняў, выдаваючы ліцэнзіі на вырубку, што наносіць неаднаўляльныя страты, бо закон ахоўвае толькі 5,4 тысячы гектараў пушчы. Астатняя, значна большая частка пушчы застаецца безабароннай.

Намаганьні навукоўцаў надаць пушчы на яе ўсёй тэрыторыі статус нацыянальнага парку вось ужо дзесяць год не даюць выніку. Усяго, чаго ўдалося дабіцца - гэта стварыць на тэрыторыі Белавежскай пушчы 13 запаведнікаў, якія ўсяго займаюць 2,4 тысячы гектараў плошчы. Гледзячы на бяздзейнасьць уладаў, распачала дзейнічаць грамадзкасьць. У Гайнаўцы ствараецца Таварыства сяброў Белавежскай пушчы. Мо, яму па сілах будзе тое, што не змаглі за дзесяцігоддзе зрабіць уладныя.

П.БАЙКО.

СПАДЧЫНА ГОРАДНІ.
Фатаграфаваў А.УЛАДАСЕВІЧ.

Я.МАЛЕЦКІ

УСЕБЕЛАРУСКІ КАНГРЭС У МЕНСКУ

З кнігі «Пад знакам Пагоні»

(Заканчэньне. Пачатак у N 32).

"Ці ня той гэта 'праўны гаспадар', які 'дзеля дабра беларускага народу' згадаў сваім бальшавіцкім бандам разагнаць Першы Ўсебеларускі Кангрэс 1917 года, а ў 1920 годзе зьнішчыць беларускую незалежную дзяржаву БНР, створаную воляй усяго беларускага народа?"

"Ці гэта той самы 'праўны гаспадар', які ў 1921 годзе ў Рызе, супольна з польскімі агрэсарамі, для дабра таго ж беларускага народу парэзаў цела сялянска-работніцкае Беларусі ды гандляваў яе тэрыторыяй як хацеў і зь кім хацеў?

"Ці гэта ня той самы 'праўны гаспадар', які ізноў жа "для дабра беларускага народу" закатаваў 1 800 000 найлепшых беларускіх сялян і работнікаў, зьнішчыў дзесяткі тысячаў беларускае інтэлігэнцыі, разбурыў беларускую гаспадарку, давёў край і народ да поўнай руіны й галечы?"

"Ці гэта ня той самы 'гаспадар', які разбурыў найкаштоўнейшыя помнікі нашай слаўнай культуры, нашыя сьвятыні, атручваў душы нашых дзяцей сваёй бязбожнай бандыцкай маралью, ізноў жа для "дабра" беларускага народу?

"Ці гэта ня той самы 'гаспадар', які пакрыў беларускі край засьценкамі НКВД, у падзямельлях якіх крывавіліся ў муках тысячы Беларусаў за імкненьне да свабоды й абарону чалавечых правоў і годнасьці?..

"Хто й калі даў вам права выступаць ад імя беларускага народу перад сьветам - вам, ягоным забойцам?.."

Свой даклад М.Шкялёнак скончыў заклікам:

"Думаю, што сярод вас, прадстаўнікоў беларускага народу, ня знойдуцца такія, што баранілі б, альбо падтрымоўвалі тыя ўсе ланцугі, тыя дагаворы й пастановы нашых ворагаў, якімі яны нас мучылі, а цяпер і надалей хочуць узаконіць нашую няволю.

"Адкінем усе гэтыя кайданы раз і назаўсёды!

"Ня будзем ніколі прызнаваць таго, хто самазванна ад нашага быццам імя гандлюе нашай воляй і справай, як чыніць за мяжою цяпер Масква, ці польскі экзыльны ўрад!.."

Першым выступіў з словам дыскусіі генэрал К.Езавітаў, удзельнік Першага Ўсебеларускага Кангрэсу 1917 году й арганізатар беларускага войска ў час існаваньня БНР. Ён, між іншага, сказаў:

"Супроць варожага беларускаму народу трактату ў Рызе ўжо ў 1921 годзе пратэставаў урад БНР і яго ніколі не прызнаваў, як і іншыя й польскія, і расейскія пастановы. Цяпер жа наступіў час, каб гэты кангрэс, як прадстаўнік волі беларускага народу, станоўка й назаўсёды адкінуў усе варожыя нам акты. Беларусь, як вольная дзяржава, народжаная ў Першай вайне, цяпер, у Другой вайне поўнасьцю дасьпела, каб стацца вольнай і незалежнай ды сама аб сабе станавіла, ніякія старыя ні новыя дагаворы ня зломяць нашай станоўкай волі да самастанаўленьня!"

Пасьля выступу ген.Езавітава была мая чарга. Я прызнаў галоўны даклад М.Шкялёнка поўнасьцю правільным як у гістарычным разрэзе, так і для нашага часу. Я сказаў:

"Скончыліся тыя часы, калі гаварылі аб нас бяз нас. Ніхто на сьвеце ня мае права выступаць ад імя беларускага народа, ня спытаўшы яго згоды. Беларускі народ, вуснамі прадстаўнікоў БНР, што прадаўжалі змаганьне за вызваленьне Беларусі, ня раз пратэставаў супроць Рыскага трактату да бальшавіцкіх парадкаў у паняволенай Беларусі пад шыльдай БССР. Цяпер крывавая Масква й яе разбойнік Сталін, засеўшы ў Тэгеране з міжнароднымі гандлярамі свабоды народаў Чэрчылем і паралітыкам Рузвельтам, заганяюць у старую бальшавіцкую няволю наш беларускі народ, а яго тэрыторыю нанава рэжуць. Мы, прадстаўнікі народу, павінны рашуча асудзіць усе гэтыя варожыя пакты й трактаты, як антыбеларускія, што ня мелі й ня маюць ніякай праўнай сілы."

"Няхай жыве Вольная Беларусь!"

"Няхай жыве сувэрэнная воля беларускага народу!"

Заля гудзела ад воплескаў, апрабуючы ануляваньне ўсіх варожых дагавораў ды няпрызнаваньне ўсякіх новых каншахтаў і намаганьняў нанава паняволіць беларускі народ.

Пасьля абедняга перапынку, на другім паседжаньні кангрэсу, А.Калубовіч, сябра БЦР, прачытаў даклад: "Аб канчальным разрыве Беларусі з Масквой і аб уневажэньні маскоўскага голасу ў беларускіх справах". Ён прааналізаваў усю фікцыйнасьць дзяржаўнасьці БССР, як чыста маскоўскі зман беларускага народу. БССР была толькі маскоўскаю, каляніяльнага тыпу, правінцыяй, у якой беларускі народ ня меў самастойнага голасу, дзе адбываўся жорсткі глум над беларускай мовай, культурай, царквой, гаспадаркай і жыхарствам - сялянамі, работнікамі й інтэлігэнцыяй.

У дыскусіі над дакладам выступала колькі прамоўцаў. Усе яны падкрэсьлівалі, што Масква з 26 гадоў свайго панаваньня нічога пазітыўнага не зрабіла для беларускага народу, адно давяла да жабрацкай долі, а цяпер сваімі бандамі спрабуе й зусім зьнішчыць наш народ. Дык ня можа быць ніякай гутаркі аб прызнаваньні ейных разбойніцкіх парадкаў ды ейных законаў.

Былі галасы й супраць пануючага стану. Так, дэлегат з Лідчыны, Анішчык-Чэмер, казаў:

"Тады, калі беларускі народ мабілізуе ўсе свае сілы на змаганьне з бальшавізмам, польскія бандыты ў Лідчыне й чорнасоценная расейшчына ў Наваградчыне, убіваюць нож у плечы нашага народу. У Лідзкай акрузе Палякі забіваюць бязкарна лепшыя сілы беларускай інтэлігэнцыі, вырэзваюць цэлыя беларускія вёскі. А што робіць у Наваградчыне, у Дзятлаве, чорнасоценная РОА, ды іншыя расейскія злучэньні, найлепш скажа прысутны тут Васіль Рагуля. Мы хочам змагацца з бальшавізмам, але мусім мець забясьпечаныя тылы. Прашу кангрэс зьвярнуцца да прэзыдэнта БЦР, каб паслаў у Лідчыну беларускія батальёны і зрабіў канец здзекам над беларускім жыхарствам!"

"Чаму гэта цяпер БЦР, як прадстаўніцы Беларусі, не падлягае ЎСЯ БЕЛАРУСЬ, так Заходняя, як Усходняя й Паўночная? Дакуль будуць нас увесь час дзяліць?! Кангрэс мусіць падаць станоўкі голас, каб уся этнічная Беларусь была зьяднаная ў непадзельную дзяржаву!"

На канцы зьезду былі прынятыя рэзалюцыі аб непрызнаваньні ўсякіх шкодных дагавораў, законаў, міжнародных пактаў, а таксама маскоўскай марыянеткі БССР. Адначасна для БЦР надавалася права рэпрэзэнтацыі інтарэсаў беларускага народу ды абароны краю на час вайны.

Пазьней, ужо на эміграцыі, ці мала было спрэчак пра БЦР ды кангрэс. Адны, атакуючы прыхільнікаў БНР, хацелі й надалей бачыць "легітымнасьць" БЦР у пастановах кангрэсу, ды прадаўжаць дзейнасьць БЦР. Другія, што стаялі пасьлядоўна на пазыцыях БНР, хацелі панізіць гэты кангрэс, як быццам "недэмакратычны" што да спосабу выбару дэлегатаў і дзеля татальнага нямецкага рэжыму, які быццам не даваў магчымасьці свабодна выявіць волю беларускага народу. Гэткія зьвінавачваньні пад адрасам зьезду несправядлівыя.

Ведама, умовы вайны, і нацысцкі таталітарны рэжым Гітлера, з пачаткавай славянагубнай праграмай, ня спрыяў выяўленьню дэмакратычных тэндэнцыяў зьезду. Ды нельга вінаваціць і зьезд, і БЦР у тым, што яны былі паслухмяныя Немцам марыянеткі тыпу бальшавіцкіх "зьездаў" у БССР. На зьезд, праўда, прыбылі дэлегаты з назначэньня, а сам ён трываў толькі адзін дзень, бо ўжо ў часе нарадаў можна было на залі паседжаньняў чуць кананады цяжкіх баёў фронту, які якраз тады маланкава набліжаўся да Менску. Ды каго іншага маглі б паслаць "дэмакратычныя" выбары, ды якую іншую ідэялёгію рэпрэзэнтавалі б "дэмакратычныя" пасланьнікі?

Гэта ж Першы Ўсебеларускі Кангрэс у 80 % складаўся з гэтак званых "абласьнікоў", ці з дэлегатаў "Западнай вобласьці", падабраных да нацкаваных бальшавікамі супроць дэмакратычнага ладу й беларускай дзяржаўнасьці. А што сталася? Беларускі народ клясава адналіты, дэмакратычны, свабодалюбівы й патрыятычны, і хоць бальшавікі акружылі будынак зьезду, а ленінска-сталінскія агэнты намагаліся запалохаць расправай за непаслухмянасьць бальшавіцкай праграме - Першы Кангрэс адкінуў бальшавіцкі лад у Беларусі ды паклікаў да жыцьця Беларускую Народную Рэспубліку - дэмакратычную дзяржаву ў этнаграфічных межах пасяленьня беларускага народу!

Тое самае паўтарылася й у Другой вайне. Гітлераўскія Немцы не перашкаджалі справе арганізацыі зьезду ды не праяўлялі намаганьняў умешвацца ў ход нарадаў. Было ім ужо не да гэтага. Дэлегаты, што прыехалі, былі такія самыя беларускія патрыёты, што й на Першым Кангрэсе, і на парадку дня паставілі ня нейкі беларускі нацызм, не марыянецтва ў карысьць Трэцяга Рэйху, але працяг нашага змаганьня за зьдзяйсьненьне Акту 25 Сакавіка 1918 году, за стварэньне сваёй незалежнай дзяржавы.

А за 25 гадоў палітычнага змаганьня беларускі рух, не зважаючы на крывавы масавы тэрор чырвонае Масквы, на глум пад Польшчай, на панесеныя аграмадныя страты ў радох патрыятычнае інтэлігэнцыі, паказальна задэманстраваў вялікі прагрэс у пашырэньні нацыянальна-палітычнай сьвядомасьці. Не засталося бяз сьледу й тое, што не зважаючы на аграмадныя разбурэньні, на вялікія цярпеньні й страшнае вынішчэньне жыхарства, і Другая вайна была часам яшчэ аднаго ўздыму да свабоды, да незалежнасьці.

На зьездзе сьцьвердзіў гэта й генэрал К.Езавітаў, удзельнік Першага Ўсебеларускага Кангрэса:

- Дваццаць пяць гадоў таму назад бальшыня дэлегатаў на Першым Кангрэсе прамаўляла па-расейску. Сёньня ўсе бяз вынятку прамаўляюць па-беларуску... Тады былі ў некаторых ухілы ў бок Расеі, сёньня адна ва ўсіх ідэя - НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ!

У вабліччы новага бальшавіцкага нахлыну зьезд ставіў галоўнай мэтай справу найважнейшую: каб перад сьветам заявіць, што беларускі народ пратэстуе супроць новых міжнародных махінацыяў пастанаўляць аб ягоным лёсе без ягонай волі. А воля ягоная адна: не нацысцкая, не гітлераўская, не бальшавіцкая, ня польскіх абшарнікаў, але свая, адвечная, справядлівая.

(Друкуецца на мове арыгіналу).

МЫ ПАВІННЫ ЎЖО СЁНЬНЯ ЗМАГАЦЦА ЗА ПРАЎДУ

Мяне зьдзіўляе бяздзейнасьць беларускіх гісторыкаў у справе распрацоўкі гісторыі беларускага нацыянальнага руху падчас апошняй вайны. Па-за кнігамі Ю.Туронка і В.Раманоўскага няма ніводнай працы, у якой бы чытач даведаўся пра Беларускую Самаахову, Беларускую Краёвую Абарону, Саюз Беларускай Моладзі, Беларускую Незалежную Партыю, Беларускую Народную Партызанку... Няма ніводнае кнігі пра гэткіх выдатных беларускіх патрыётаў, як кс.В.Гадлеўскі, Ст.Грынкевіч (старэйшы), М.Шкялёнак, Ус.Родзька, М.Вітушка, Ю.Саковіч...

Можна, канешне, сказаць, што не пасьпелі, што ў архівы КДБ пускаюць толькі "избранных"... Але ці можа гэта быць апраўданьнем? Нельга без зайздрасьці глядзець на працу ўкраінскіх гісторыкаў, якія грунтоўна распрацоўваюць гісторыю ОУН, УПА, пішуць кнігі пра Я.Канавальца, С.Бандэру, Р.Шухевіча. А ў нас?.. Вялікі дзякуй украінцу гісторыку Ул.Гуленку, які ўжо шмат гадоў вывучае "белыя плямы" ІІ-ой сусьветнай вайны на Беларусі. А што беларусы? Праф. А.Хацкевіч працягвае рэабілітоўваць польскую Армію Краёву, але адначасна фашысьціць беларускі нацыянальны рух. Дарэчы, чамусьці вывучэньне дзейнасьці АК на Беларусі больш за ўсё займае беларускіх гісторыкаў. А іх функцыі пераймаюць розныя "спецыялісты" з "Советской Белоруссии", "Мы и время". І яны ізноў льюць бруд на беларускіх патрыётаў, не падзяляючы іх і сьвядомых калябарантаў.

Можа тады ёсьць сэнс перавыдаць эмігранцкія кнігі: "Другі Ўсебеларускі Кангрэс", "За Дзяржаўную Незалежнасьць Беларусі" (зборнікі дакумантаў), "Пад знакам Пагоні" (успаміны) Я.Малецкага? Але спроба перавыдаць кнігу Я.Найдзюка і У.Касяка "Беларусь учора і сёньня" скончылася арыштам гатовага да продажу накладу! Што ж не спадабалася цэнзарам? Можа тое, што "на зьмену фашыстоўскай прыйшла расейска-бальшавіцкая акупацыя"? Як бачым, гісторыя, як і раней, залежыць ад палітыкі. Асабліва пільна аберагаюць гэтыя цэнзары гісторыю ІІ-ой сусьветнай вайны на Беларусі. Вельмі яны баяцца, што праўда пра тыя часы можа не панравіцца ўсходняму суседу. Вось гісторыкі й ня хочуць займацца некаторымі тэмамі, альбо займаюцца, але не друкуюць вынікі сваёй працы. Чакаюць палітычных зьмен. Як кажуць, куды вецер падзьме...

А пакуль маўчаць нашыя гісторыкі, паміраюць апошнія сьведкі і ўдзельнікі ўспомненых падзей. Пры ўладзе камуністых яны маўчалі, маўчаць і цяпер. Яны забяруць з сабою ў магілу сьведчаньні пра сапраўдную дзейнасьць савецкіх партызанаў, пра Беларускую Народную Партызанку, Беларускую Краёвую Абарону... І калі праз пяць, або дзесяць гадоў нарэшце пачнецца пісацца праўдзівая гісторыя, дык яна будзе значна бяднейшая бяз гэтых сьведчаньняў. Так, як сёньня гісторыя вайны паказана толькі з аднаго боку - расейскага. Калі ж мы зірнем на яе "беларускімі вачыма"?

Але ня трэба думаць, што гэта адбываецца толькі ў нас. Падобнае становішча назіраецца і ў Сербіі. Вось што лідар сербскіх дэмакратаў Вук Драшкавіч сказаў у інтэрв'ю "Комсомольской правде":

"Вы ведаеце, што сербы-камуністы забілі болей сербскіх сьвятароў, чымсьці харвацкія ўсташы? У 1944-1945 гадох яны зьнішчылі 250 тысяч чалавек. За тры дні ў кастрычніку 44-га бяз суда было расстраляна 12 тысяч: прафесары, акадэмікі, акцёры, сьвятары. Сербскі народ згубіў свае духоўныя вышыні... Але ён (Прэзыдэнт Сербіі Слабадан Мілошэвіч - С.Д.) не дае расказаць праўду пра злачынствы партызан. Да гэтага часу злачынцы жывуць у самым фешэнебельным раёне Бялграда..." ("К.П.", 13 кастрычніка 1993г.)

Мя яшчэ мала ведаем пра бальшавіцкі тэрор пасьля ліпеня 1944г. Чамусьці ў нас больш успамінаюць тэрор даваенны, а паваенны закранаюць мімаходзь. Чаму так? Можа таму, што пасьля вайны ён быў яшчэ страшнейшы, чымсьці ў 20-30-ыя гады? А можа і таму, што тэрор гэты выклікаў моцны і адчайны ўзброены супраціў народа бальшавікам?..

(Заканчэньне на 6-й стар.)

МЫ ПАВІННЫ ЎЖО СЁНЬНЯ ЗМАГАЦЦА ЗА ПРАЎДУ

(Заканчэньне. Пачатак на 5-й стар.)

У 1950 г. у Парыжы былі выдадзены ў французкім перакладзе ўспаміны былога іспанскага камуністычнага генэрала Валентына Ганзалес (пад псэўданімам "Земляроб") - "Жыцьцё і сьмерць у СССР". Генэрал Ганзалес пасьля грамадзянскае вайны ў Іспаніі выехаў у СССР, дзе неўзабаве трапіў у бальшавіцкія лагеры. У 1949 г. яму ўдалося ўцякчы адтуль на Захад.

У сваіх успамінах ён піша і пра Беларусь. Ген.Ганзалес цьвердзіць, што з усіх савецкіх рэспублік Беларусь пацярпела ад НКУС найбольш. У гадох 1944-1946 на Беларусі адбыліся тры вялікія "чысткі" насельніцтва. У 1944 "чысьцілі" пад закідам шпіянажу і пераважна расстрэльвалі. Расейскае войска пад кіраўніцтвам НКУС расстрэльвала нават 13-гадовых дзяцей. У 1945 г. адшуквалі "здраднікаў Радзімы" і вывозілі ў Сібір. Ген.Ганзалес цьвердзіць, што з Беларусі было вывезена каля мільёну чалавек. У 1946 г. адбылася найбольш лютая "чыстка" насельніцтва, калі мноства народу было вывезена ў Сібір і разьмешчана ў мясцовых канцэнтрацыйных лагерах.

У Смаленску на прасторы каля 150 км кв. у 1948 г. было назганяна больш за 62000 нявінных людзей. Там іх рассартоўвалі па розных раёнах Сібіры на прымусовыя работы. Найбольш пацярпела Віцебшчына, бо там падчас нямецкай акупацыі была школа "Абвэру". У мясцовым лагеры знаходзілася больш 55000 вязьняў. У Вязьме было загнана за калючы дрот 18000 чалавек. Апрача гэтага, больш чым 90000 арыштаваных было ў канцлагерах, што знаходзіліся ў ваколіцах Менску, Рагачова, Каленкавіч, Крычава, Баранавіч і Глыбокага. Працавалі там людзі па 12-14 гадзін у дзень і атрымоўвалі па 100 грамаў хлеба. Усе вязьні былі асуджаны фактычна на павольную сьмерць.

Вось гэткія ўспаміны напісаў ген.Ганзалес. Можна паставіць пад сумненьне некаторыя факты, пададзеныя аўтарам, але існаваньне канцэнтрацыйных лагероў на Беларусі пасьля вайны - гэта рэальны факт. Але да сёньняшняга дня пра гэта ня ведаюць маладыя пакаленьні, а дзяды нашыя ня хочуць успамінаць тыя часы, бо гэта выклікае боль і страх...

Прыйдзе час, калі мы даведаемся пра дзесяткі пасьляваенных Курапатаў і на магілах бязвінных ахвяраў чырвонага фашызму будуць пастаўленыя крыжы. А дзеля набліжэньня гэтага дня, мы павінны ўжо сёньня змагацца за праўду пра ваенныя й пасьляваенныя падзеі на Беларусі. Гэта наш абавязак перад Богам, перад гісторыяй, перад памяцьцю мільёнаў ахвяр акупантаў з Захаду і Ўсходу.

Сяргей ДУДАЛІЧ.

Кавальскае майстэрства Юрася Мацко добра ведаюць на Беласточчыне, Віленшчыне і Гарадзеншчыне. Спадар Мацко - пастаянны ўдзельнік выстаў народнага прыкладнога рамяства. Яго вырабы, а гэта ажурныя краты, падсвечнікі, культавыя прылады, карыстаюцца вялікім попытам.



НА ФАТАЗДЫМКАХ: Ю.МАЦКО пад час прэзэнтацыі выставы, прысьвечанай краявідам роднага краю: ваконныя краты работы мастака.

СУД НЕ АДБЫЎСЯ

Газета "Пагоня" пісала, што Мікалай Аляксандравіч Мельнікаў, які безпадстаўна звольнены з працы ў ГрДУ, падаў у суд, каб аднавіцца на працы. Да рэдакцыі да гэтага часу надыходзяць лісты ад былых вучняў і простых людзей, якім неабыякавы лёс педагога і навукоўца М.А.Мельнікава. На жаль, надрукаваць іх поўнасьцю мы ня маем магчымасьці па агульнавядомай прычыне - дэфіцыту газетнай плошчы. Але больш цікавыя, на думку рэдакцыі, вытрымкі з лістоў прапануем нашым чытачам:

"Дарагі Мікалай Аляксандравіч! Хачу прызнацца Вам у пачуцьці глыбокай пашаны да Вас як Настаўніка, шчыра заяўляю, што як славесьніца я чаго-небудзь дасягнула ў жыцьці дзякуючы толькі Вам".

Гэта радкі з ліста настаўніцы СШ N 9 г.Слоніма Т.М.Шарпай.

Галіна Дземчанка - настаўніца СШ N 25 Горадні ў сваім лісьце ў рэдакцыю ўспамінае іспыты, якія здавала спадару Мельнікаву:

"Мікалай Аляксандравіч спакойна перапыніў мяне і прапанаваў пачытаць свае вершы. Выслухаўшы іх, сказаў: "Вы будзеце настаўніцай літаратуры".

"Сапраўдны педагог - гэта чалавек, які любіць сваю справу, свой прадмет, сваіх вучняў. Менавіта такім педагогам з'яўляецца М.А.Мельнікаў," - піша ў сваім лісьце псіхолаг СШ N 10 г.Горадні Н.А.Сіманава.

Такіх лістоў мноства, іх аўтары ня толькі выказваюць падзяку і спагаду свайму выкладчыку, але і турбуюцца яго лёсам, вынікамі суда.

Прыкра, бо суд пакуль што перанесены на 19 кастрычніка, з-за таго, што прадстаўнік універсітэту Краўцэвіч ня меў адпаведных папер на права прадстаўляць у судзе інтарэсы ГрДУ.

ПОЛЬСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

ПАНЯДЗЕЛАК, 17.10

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава цы гарбата? 09 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 09 30 Праграма для дзяцей. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультфільм. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Мы і нашы дзецы. 10 55 Англійская мова для дзяцей. 11 05 "Дынастыя Колбі". Серыял вытв. ЗША. 12 00 Прыемнае з карысным. 12 30 Тэлетурнір 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнэс. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Хроніка 80-х. 13 55 Дакументальны фільм. 14 55 Вагнём і мячом. 15 10 Паляўнічыя за таямніцамі. 15 20 Энцыклапедыя другой сусветнай вайны. 15 40 Таямнічая гісторыя СССР. 15 55 Праграма дня. 16 00 Музычны журнал. 16 30 Маладзёжная праграма. 17 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 17 25 Для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Публіцыстычная праграма. 19 10 Серыял вытв. Англіі. 19 40 Юбілейная праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 15 Тэлетэатр. "Пажыццёва". 22 45 Мініацюры. 22 50 Пульс дня. 23 10 Тыдзень прэзідэнта. 23 45 Публіцыстычная праграма. 00 00 Навіны. 00 20 "Двое блаславёных". Фільм вытв. Швецыі. 01 45 Забаўляльная праграма.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 20 Курс англійскай мовы. 08 30 Раніца. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Барабара і Ян". Серыял вытв. Польшчы. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 05 Мультфільм для дзяцей. 11 30 Праграма па заяўках. 14 00 Панарама. 14 20 "Гэта цудоўная сямейка". Серыял вытв. Францыі. 15 05 Тэлежурнал. 15 55 Прывітанне. 16 00 Мультфільм. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Тэлежурнал. 17 10 Айчына. 17 30 Парыж. 18 00 Дакуменатльныфільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Кола фартуны. 20 35 Мультфільм. 21 00 "Прыпынак Аляска". Серыял вытв. ЗША. 21 45 Рэпартаж. 22 00 Панарама. 22 30 Рэпартаж. 23 30 Сад мастацтваў. 00 00 Публіцыстычная праграма. 00 40 Варшаўскі кінафестываль. 01 00 Панарама. 01 05 Спартыўная студыя. 01 15 Канцэрт.

АЎТОРАК, 18.10

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава цы гарбата? 09 00 "Першыя пацалункі". Серыял вытв. Францыі. 09 30 Для дзяцей. 09 55 Гімнастыка. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаворым пра дзяцей. 10 55 Англійская мова для дзяцей. 11 00 Серыял вытв. ЗША. 11 45 Еўрапескі партрэт. 12 00 Рынак працы. 12 20 Запрашэнне да стала. 12 30 Сто год. 12 40 Тэлежурнал. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнэсс. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Лабараторыя. 14 00 Дакументальны фільм. 14 30 Джойсцік. 14 50 Кніга цудаў тэхнікі. 15 05 Лік матэматыкі. 15 20 Дакументальны фільм. 15 45 У свеце навукі. 15 50 Праграма дня. 16 00 Музычная праграма. 16 30 Праграма для моладзі. 17 00 "Першыя пацалункі". Серыял вытв. Францыі. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Арыя са смехам. 18 40 Здароўе. 19 05 Мультфільм. 19 30 Сенсацыі XX стагоддзя. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Без пачуццяў". Фільм вытв. Францыі. 22 40 Пульс дня. 23 00 Што новага? 23 15 Сеймограф. 23 30 Пісьма об гаспадарцы. 00 00 Навіны. 00 20 Дакументальны фільм. 01 10 Культурна-публіцыстычная праграма. 02 10 Музычная праграма.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 20 Курс англійскай мовы. 08 30 Раніца. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Барабара і Ян". Серыял вытв. Польшчы. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 00 Мультфільм. 11 30 Праграма па заяўках. 14 00 Панарама. 14 20 "Двое шустрых з Анталіі". Серыял вытв. Германіі. 15 10 Тэлежурнал. 15 55 Прывітанне. 16 00 Мультфільм. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Жывёлы вакол нас. 17 30 Дакуменатльны фільм. 18 30 Рэпартаж. 18 55 Розыгрыш лато. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Телетурнір. 20 35 Забаўляльная праграма. 21 00 "Справы Росі О'Нэйл". Серыял вытв. ЗША. 21 45 Цені жыцця. 22 00 Панарама. 22 35 Экспрэс рэпарцёраў. 23 05 Канцэрт. 00 00 Спартыўная студыя. 01 00 Панарама. 01 05 Спартыўная студыя. 01 15 Тэлежурнал.

ЧАЦВЕР, 20.10

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава ці гарбата. 09 00 "Дзіцячае аддзяленне". Серыял вытв. Англіі. 09 30 Для дзяцей. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультфільм. 10 00 Навіны. 10 10 Праграма для дзяцей. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаварым пра дзяцей. 10 55 Англійская мова для дзяцей. 11 05 "Спякота тропікаў". Серыял вытв. ЗША. 12 00 Кулінарная праграма. 12 20 Это лёгка. 12 30 Чвэрць гадзіны на экране. 12 45 Бяспечнае жыццё. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнэсс. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Такі пейзаж. 14 00 Паміж намі жывёламі... 14 20 Жывёлы свету. 14 50 Рабінзоны. 15 10 Тэлежурнал. 15 25 Першы год жыцця дзіцяці. 15 50 Праграма дня. 16 00 Маладзёжная музыка. 16 30 Для маладых гледачоў. 17 00 Праграма для моладзі. 17 25 "Гдe Валі?". Серыял вытв. Англіі. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Кінажурнал. 18 40 Такі свет. 19 05 "Маленькі цуд". Серыял вытв. ЗША. 19 30 Каталіцкая праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Спякота тропікаў". Серыял вытв. ЗША. 22 05 Толькі ў першай праграме. 22 50 Сатырычная праграма. 23 00 Урадавы журнал. 23 10 Ваенны кінажурнал. 23 25 Пегас. 00 00 Гаспадарчыя навіны. 00 15 Мініацюры. 00 20 Сады. 00 50 Біяграфічны фільм. 02 20 Рэпартаж.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 20 Курс англійскай мовы. 08 30 Раніца. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Прыгоды пана Міхала". Серыял вытв. Польшчы. 10 00 Трансляцыя паседжанняў сейма. 14 00 Панарама. 16 00 "Тарзан". Серыял вытв. Германіі. 16 30 Летні журнал. 17 00 Дакуменатльны фільм. 17 30 Забаўляльная праграма. 18 00 Дакуменатльны фільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Кола фартуны. 20 35 Клуб пана Рыся. 21 00 Джаз-Джамборы-94. 22 00 Панарама. 22 35 Аўтажурнал. 23 00 "Злачынства сэрца". Фільм вытв. ЗША. 00 45 Рэпартаж. 01 00 Панарама. 01 05 Спартыўная праграма. 01 15 Джаз-Джамборы-94.

ПЯТНІЦА, 21.10

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава ці гарбата. 09 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 09 30 Праграма для дзяцей. 09 55 Гімнастыка. 10 00 Навіны. 10 10 Праграма для дзяцей. 10 25 Дашкольнікі дома. 11 00 "Маладыя коннікі". Фільм вытв. ЗША. 12 00 Школа для бацькоў. 12 15 Пашый сама. 12 30 Захаваем помнікі. 12 40 Тэлежурнал. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнэсс. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Селскагаспадарчая праграма. 13 45 Якая школа. 14 10 Хто ты ёсць? 14 30 Стан душы. 14 50 Калі не Оксфард, дык што? 15 10 Тэлетурнір. 15 25 Бізнэс па амерыканскі. 15 55 Праграма дня. 16 00 Музычныя тэлетурніры. 16 30 Забаўляльная праграма. 16 55 Музычная праграма. 17 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 17 25 Для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Тэлежурнал. 18 30 Штотыднёвік культуры. 18 40 Тэлежурнал спажыўца. 19 05 Спадканне уцёмную. 19 50 Сатырычная праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Уладар мух". Камедыя вытв. ЗША. 22 45 Пульс дня. 23 10 Чвэрць гадзіны. 23 35 Справа для рэпарцёра. 00 00 Навіны. 00 15 Блізкія сустрэчы. 00 35 Тэлежурнал. 01 15 "Жанчыны на мяжы нэрвовага зрыва". Фільм вытв. Іспаніі. 02 40 Забаўляльная праграма.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 20 Курс англійскай мовы. 08 30 Раніца. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 Серыял вытв. Данііі. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакуменатльны фільм. 11 00 Мультфільм. 11 30 Праграма па заяўках. 14 00 Панарама. 14 20 "Чараўнік з вуліцы вязаў". Серыял вытв. ЗША. 15 10 Тэлежурнал. 15 55 Прывітанне. 16 00 Праграмма для дзяцей. 16 30 Спартыўная студыя. 17 30 "З дзевяці да пяці". Камедыйны серыял вытв. ЗША. 18 00 Дакуменатльны фільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Адзін з дзесяці. 20 35 Тэлежурнал. 21 00 Джаз-Джамборы-94. 22 00 Панарама. 22 30 Забаўляльная праграма. 23 05 "Карабель". Фільм вытв. Германіі. 01 15 Панарама. 01 20 Спорт. 01 30 Джаз-Джамборы-94.

СУБОТА, 22.10

ПРАГРАМА 1

08 00 З Польшчы. 08 10 Прашу адказаць. 08 25 Усё аб аграрадзе 08 50 Атралінія. 09 30 Спартыўны тэлежурнал. 09 55 Праграма дня. 10 00 Навіны. 10 10 Праграма каталіцкай рэдакцыі для дзяцей. 10 35 Праграма для дзяцей. 12 00 Дакументальны фільм. 13 00 Навіны. 13 10 Забаўляльная праграма 13 55 Жывёлы свету. 14 30 Мультфільмы У. Дыснэя. 15 55 Тэлежурнал. 17 00 Краіна. 17 30 Хатнія сцэны. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 45 Забаўляльная праграма. 19 05 "Бэвэрлі Хілз". Серыял вытв. ЗША. 20 00 Дзіцячы тэлежурнал. 20 10 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Парк Горкага". Фільм вытв. ЗША. 23 20 Сустрэча. 00 15 Навіны. 00 25 Спартыўная субота. 00 35 Музычная праграма. 01 20 "Японская статуэтка". Фільм вытв. ЗША. 02 40 "Забоу". Фільм вытв. Германіі.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Аркестровая музыка. 08 30 Такія адзінокія. 08 50 Урок мовы глуханямых. 08 55 Прывітанне. 09 00 Таварыства ў культуры. 09 30 Мультфільм. 10 00 Мясцовая праграма. 11 00 Ваенны журнал. 11 30 Праграма пра жывёл. 12 00 Праграма для дзяцей. 13 00 Акадэмія польскага кіно. 14 45 Дакуменатльны фільм. 15 40 Жыццё побач з намі. 16 10 Спартыўная студыя. 16 45 Студыя другой праграмы. 17 00 Серыял вытв. ЗША. 17 30 Телетурнір. 18 00 Вялікая гульня. 18 55 Розыгрыш лато. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 19 30 Семь дзён - свет. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Дзірка ў кошыку. 21 00 Забаўляльная праграма. 22 00 Панарама. 22 30 Слова на нядзелю. 22 35 Музыяны журнал. 23 00 Міс Польшча-94. 23 20 "Па-за закона". Вестэрн вытв. ЗША. 01 20 Панарама. 01 25 Джаз-Джамборы-94.

НЯДЗЕЛЯ, 23.10

ПРАГРАМА 1

08 00 Сельская гаспадарка ў свеце. 08 15 Далёка і блізка. 08 30 Тыдзень. 09 00 Сельскагаспадарчая праграма. 09 25 Праграма дня. 09 30 Нядзельная кінапраграма. 09 55 Тэлераніца. 10 30 Музычны яшчык 11 05 Серыял вытв. Канады. 12 00 Навіны. 12 10 Дакументальны фільм. 13 15 Телеканцэрт пажаданняў. 13 45 З камерай сярод жывёл. 14 00 Цырк фізікаў. 14 20 Мора. 14 55 У старым кіно. 16 35 Ён ці хто? 17 05 Няма з чаго смяяцца. 17 35 Антэна. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Можна пасмяяцца. 19 05 "Дынастыя Колбі.". Серыял вытв. ЗША. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Па зову сэрца". Серыял вытв. Італіі. 22 00 Спартыўная нядзеля. 22 25 Галівудскія чарадзеі. 22 50 Публіцыстычная праграма. 23 20 Забаўляльная праграма. 00 15 Аб таямніцах. 00 40 "Два твары помсты". Фільм вытв. ЗША. 01 50 Магічны востраў.

ПРАГРАМА 2

08 00 Рэха тыдня. 08 30 Фільм для глухіх. 09 15 Слова на нядзелю. 09 20 Прывітанне. 09 30 Фестываль Закопане-94. 10 00 Мясцовая праграма. 11 00 Дакуменатльны фільм. 12 05 Мультфільм для дзяцей. 13 00 Камедыя вытв. Англіі. 14 30 Рэпартаж. 15 00 Вандраванне ўчасе і прасторы. 16 00 Тэлетэатр для дзяцей. 16 50 Другая праграма. 17 00 "Як ёсць". Серыял вытв. Польшчы. 17 30 Тэлетурнір. 18 00 Міс Польшча-94. 19 25 Спартыўная студыя. 19 50 Мясцовая праграма. 20 00 Телетурнір. 20 35 Мультфільм. 21 00 Весела ці сумна. 21 50 Фестывальная студня. 22 00 Панарама. 22 30 Тэлепрадстаўленне. 23 20 "Сямейныя фотаздымкі". Серыял вытв. ЗША. 00 10 Джаз-Джамборы-94. 01 10 Панарама. 01 15 Джаз-Джамборы-94.

ПАНЯДЗЕЛАК, 17.10

Беларускае тэлебачанне

16.50 Праграма перадач. 16.55 Тэлебачанне — школе. Пазакласнае чытанне. Анатоль Клышка "Францыск Скарына". 17.15 "Бімбат". Вясёлы панядзелак. 17.30 Навіны (з сурдаперакладам). 17.40 Новая "Крыніца". Да выхаду першага нумара часопіса. 17.50 Беларускі тур. Падарожжы, сустрэчы, адпачынак. 18.10 Абласныя навіны (Брэст). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 Аэробіка. 19.30 Праспект. Інфармацыйна-аналітычная праграма. 20.00 Пяць хвілін на жарты. 20.10 Спартыўны тэлекур'ер. 20.30 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.35 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Вертыкаль. Пошта Прэзідэнта — роздум аб набалелым. 22.15 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Студыя "Тэлесябрына". Імгненне шчырасці. Пад купалам Сусвету. Надвор'е. "Паласа Сімарона". Тэлевізійны шматсерыйны маст. фільм (ЗША).

Канал "Астанкіна"

17.00 Лабірынт. Усход—Захад. Залаты і гандлёвы шлях Расіі. 17.30 Загадка СБ. 17.40, 20.30 Надвор'е. 17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". І.Сыцін. 17.50, 20.00, 22.50 Навіны. 18.00 Гадзіна пік. 18.25 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 18.55 Калі... Вядучы — У. Познер. 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 Гол. 21.10 Сустрэча для вас. А.Меншыкаў. 21.55 Кабарэ "Усе зоркі". 22.35 Праграма "У". 23.00 Шэсць вечароў з Ю. Нікуліным. 23.35 Аўта-шоу. 23.50 Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

17.25 Выратаванне 911. 18.20 Вуснамі дзіцяці. 18.50 Ніхто не забыты. 19.00, 22.00 Весткі. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 "Спрут-6". Маст. фільм (Італія). 20.40 Рэпарцёр. 21.00 Момант ісціны. На пытанні А. Каравулава адказвае дэпутат Дзяржаўнай думы Л. Някрасаў. 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Спартыўная карусель. 22.30 "Каралева Лізавета". Праграма Бі-бі-сі. 23.30 Зоркі гавораць.

АЎТОРАК, 18.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Дзелавы веснік. 8.25 Пад купалам Сусвету. 8.35 Надвор'е. 8.45 Пяць хвілін на жарты. 8.50 "Птушыная восень". Кінапарыс. 9.00 Тэлебачанне — школе. Пазакласнае чытанне. Анатоль Клышка. "Францыск Скарына". 9.20 "Чарапашкі ніндзя". Мультсерыял. 9.45 "Паласа Сімарона". Тэлевізійны маст. фільм (ЗША). 11.00 "АВС-клуб". Англійскую мову вучым самі. 11.15 Партрэт на фоне часу. Акцыянернае таварыства "КІМ" г. Віцебска. 11.45 "Шчыра Ваш..." Маст. фільм. 13.10 "Песні Разенбаума". Фільм-канцэрт. 15.05 Праграма перадач. 15.10 "Як нараджаецца музыка?" Хормайстар Галіна Цітова. 15.45 "Нов і К"-топ-10. 16.45 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. Ян Баршчэўскі. "Шляхціц Завальня". 17.15 "Бімбат". Спачатку было слова... 17.30 Навіны (з сурдаперакладам). 17.40 Залатая ініцыятыва. Прапановы бізнесменаў па здабычы золата. 18.10 Абласныя навіны (Віцебск). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 Эканамікст. 19.10 Эканамічная хваля. Напярэдадні зімы. Прамая лінія. 19.55 Калейдаскоп выставак. 20.10 "Васьміножкі". Мультфільм для дарослых. 20.20 Пяць хвілін на жарты. 20.30 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.35 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Пад купалам Сусвету. 21.45 Надвор'е. 21.55 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — "Маё каханне, мой смутак". "Сталіца". Тэлечасопіс.

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца. 6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны. 7.00 Працяг праграмы "Раніца". 8.00 "Вайна гобатаў". Мультсерыял. 8.25 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 9.25 А. Рэспігі. "Птушкі". Сюіта для аркестра. 14.00 "Гарачаў і іншыя". Тэлесерыял. 15.00 Вясёлыя ноткі. 15.30 Паміж намі, дзяўчынкамі. 16.00 Джэм. 16.20 "Элен і рабяты". Маладзёжны серыял. 16.50 Свет сёння. 17.00 "Ведзі". 17.30 Чалавек і закон. 17.40, 20.30 Надвор'е. 17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". К. Орф. 18.00 Гадзіна пік. 18.25 "Дзікая Роза". Тэлесерыял. 18.55 Тэма. 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 З першых рук. 20.50 Да 50-годдзя Перамогі. Маст. фільм "Смага". 22.25 Новыя жыхары. 23.05 "Паміж двух азёраў і вышэй за воблакі". Аб народных талентах г. Інтэрлакен (Швейцарыя). У перапынку (23.50) — Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

6.30 Формула-730. 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі. 7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей. 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі. 8.25 Гандлёвы дом. 8.40 Момант ісціны. 9.35 Чароўны куфэрак. 9.50 Каралеўская міля. 10.35 Тэлегазета. 10.40 Сялянскае пытанне. 15.20 "Пірацкі востраў". Маст. фільм (Аўстралія). 2-я серыя. 15.45 Там-там навіны. 16.00 Свята кожны дзень. 16.10 Новая лінія. 16.50 Не быць дыназаўрам. 17.05 Галасы. 17.35 Парадак дня. 18.00 L-клуб. 18.50 Ніхто не забыты. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 Джаз-клуб. "Вясёлыя рабяты з Англіі". 20.10 Футбол. Кубак УЕФА. "Дынама" (Масква) —"Рэал" (Мадрыд). 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Спартыўная карусель. 22.30 Экран крымінальных паведамленняў. 22.40 Футбол. Кубак УЕФА. "Нант" (Францыя) — "Тэкстыльшчык" (Камышын). У перапынку — Зоркі гавораць.

СЕРАДА, 19.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Эканамікст. 8.20 Пад купалам Сусвету. 8.30 Надвор'е. 8.40 Пяць хвілін на жарты. 8.50 "Дзілі-Далі ў Мурчынпарку". Мультфільм. 9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. Ян Баршчэўскі "Шляхціц Завальня". 9.30 "Маё каханне, мой смутак". 10.30 Аэробіка. Урокі Наталлі Наважылавай. 11.00 — 11.15 "Бімбат". Спачатку было слова... 16.00 Праграма перадач. 16.05 Відзьма-нявідзьма. Навіны кіна-відэа-аўдыё. 17.05 "Бімбат". Сустрэча з пісьменнікам Генадзем Грыневічам. Прамая лінія. 17.30 Навіны (з сурдаперакладам). 17.40 Якія мы гаспадары? Вопыт жыллёвага будаўніцтва на Гомельскім заводзе "Крыштал". 18.10 Абласныя навіны (Гомель). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Карамболь". Ток-шоу з удзелам маскоўскага мастака Барыса Краснова. 19.30 Крэда. Праграма для дзелавых людзей. 19.50 У нас дома. Праграма для сям'і. 20.30 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.35 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Пяць хвілін на жарты. 21.40 Пад купалам Сусвету. 21.50 Надвор'е. 22.00 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння "Маё каханне, мой смутак". Аўта-парк.

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца. 6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны. 7.00 Працяг праграмы "Раніца". 8.00 "Вайна гобатаў". Мультсерыял. 8.25 "Дзікая Роза". 9.00 Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам). 10.00 Амерыка з М. Таратутам. 14.00 "Гарачаў і іншыя". 15.00 Паглядзі, паслухай. 15.20 Адказы. 16.00 Сіняя птушка. 16.20 "Элен і рабяты". Маладзёжны серыял. 16.50 Свет сёння. 17.00 Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір". 17.30 Мініяцюра. 17.40, 20.30 Надвор'е. 17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Д. Туту. 18.00 Гадзіна пік. 18.25 "Дзікая Роза". 18.55 У пошуках згубленага. Л. Арлова. 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 Маналог. 20.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. "Спартак" (Масква) — "Баварыя" (Мюнхен). 23.00 Максіма. 23.20 Прэс-экспрэс. 23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд з 9-ці матчаў.

Канал "Расія"

6.30 Формула-730. 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі. 7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей. 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі. 8.25 Гандлёвы дом. 8.40 "Санта-Барбара". 9.30 Вялікі хакей. 10.00 Пушкінскі дом. 10.40 Сялянскае пытанне. 15.20 Студыя "Рост". "Чый бок?" 15.50 Там-там навіны. 16.05 Свята кожны дзень. 16.15 Тэлегазета. 16.20 Далёкі Усход. 17.00 М-трэст. 17.15 Казкі для бацькоў. 17.45 Асеннія вяселлі. 17.55 Рубяжы. 18.10 Фільм-прэм'ер. 18.25 Залатая шпора. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 "Санта-Барбара". 20.25 Астралогія кахання. С. Захараў. 21.00 "60 хвілін". Праграма Сі-бі-эс і Расійскага ТБ. 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Спартыўная карусель. 22.30 Экран крымінальных паведамленняў. 22.40 Майстры. Скульптар Ю. Арэхаў. 23.25 Зоркі гавораць.

Санкт-Пецярбург

16.25 Сем пятніц на тыдні. 16.45, 19.25 Музычны момант. 16.50 "Ліцэй, 19 кастрычніка". Тэлефільм. 17.10 Выбары-94. 17.55 Гістарычны альманах. 18.30, 21.30 Інфарм ТБ. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль. 19.30 "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы". Маст. фільм. 20.15 Блеф-клуб. 20.50 "Граф Нулін". Главы з рамана А. С. Пушкіна чытае С. Юрскі. 21.10 Тэлемагазін. 21.15 Тэлеслужба бяспекі. 21.45 Спартыўныя навіны. 22.00 Ваш стыль. 22.05 "Богу помач вам, сябры мае..." Прэм'ера "Лентэлефільма".

ЧАЦВЕР, 20.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Пад купалам Сусвету. 8.20 Надвор'е. 8.30 Пяць хвілін на жарты. 8.40 Крэда. Праграма для дзелавых людзей. 9.00 "Маё каханне, мой смутак". 10.00 "Сунічны дожджык". Мультфільм. 10.05 "Жанчына дня". Маст. фільм. 11.30 "Свята натхнення". Фільм-канцэрт. 12.00 "Бімбат". Сустрэча з пісьменнікам Генадзем Грыневічам. 12.25 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Карамболь". Ток-шоу з удзелам маскоўскага мастака Барыса Краснова. 12.55 — 13.40 Настальгічны дывертысмент. Гісторыя ДАВТа Беларусі ў асобах. Частка 1-я. 15.30 Праграма перадач. 15.35 Заключны канцэрт фестывалю мастацтваў Беларускага універсітэта культуры. Перадача 1-я. 16.45 Тэлебачанне — школе. Прыродазнаўства. Расліны і жывёлы вадаёмаў. 17.05 "Бімбат". Марсельеза. 17.30 Навіны (з сурдаперакладам). 17.40 Дзедка за рэпку. Парады агароднікам. 18.10 Абласныя навіны (Гродна). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 Стоп-кадр. Крымінальная хроніка. 19.20 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Науцілус". Праграма для аматараў турызму і адпачынку. 19.40 Калыханка. 20.00 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.05 Хакей. "Цівалі" (Мінск) — "Спартак" (Масква). 3-ці перыяд. 21.00 Панарама. 21.35 Пяць хвілін на жарты. 21.40 Пад купалам Сусвету. 21.50 Надвор'е. 22.00 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — "Маё каханне, мой смутак". Што на свеце пачуваецца? Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Супермадэль Беларусі-95".

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца. 6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50, 0.50 Навіны. 7.00 Працяг праграмы "Раніца". 8.00 "Вайна гобатаў". 8.25 "Дзікая Роза". 9.00 "Жыццё заапаркаў". 9.35 Спявае І. Пляшыўцаў. 14.00 "Гарачаў і іншыя". 15.00 Сустрэча пісьменнікаў, кампазітараў і паэтаў з рабятамі ў канцэртнай студыі Астанкіна. 16.00 Мульцітролія. 16.20 "Элен і рабяты". Маладзёжны серыял. 16.50 Свет сёння. 17.00 ...Да 16 і старэйшым. 17.40, 20.30 Надвор'е. 17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". У. Нобіле. 18.00 Гадзіна пік. 18.25 "Дзікая Роза". 18.55 Аўтарская праграма В. Ярафеева. "Дзе так вольна дыхае чалавек?" 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 Масква — Крэмль. 21.00 Лато "Мільён". 21.30 "Рока і яго браты". Маст. фільм (Італія). У перапынку (23.50) Прэс—экспрэс.

Канал "Расія"

6.30 Формула-730. 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі. 7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей. 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі. 8.25 Паехалі. 8.35 "Санта-Барбара". 9.25 Ранішні канцэрт. 9.45 На палітычным Алімпе. 10.35 Тэлегазета. 10.40 Сялянскае пытанне. 15.20 Студыя "Рост". 15.50 Там-там навіны. 16.05 Свята кожны дзень. 16.15 Мульці-пульці. "Вялікі Ух". 16.25 Новая лінія. 17.05 Кліп-антракт. А. Газманаў. 17.10 Будні. 17.50 У свеце аўта- і мотаспорту. 18.20 Свая гульня. 18.50 Пяць хвілін аб добрым жыцці. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 "Санта-Барбара". 20.25 Бенефіс Аляксандра Басілая. 21.30 Я — лідэр. 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Спартыўная карусель. 22.30 Плошча мастацтваў. Дырыжор І. А. Мусін. 23.30 Зоркі гавораць.

Санкт-Пецярбург

16.25 "Вясёлы ашуканец", "Непераможныя". Мультфільмы. 16.45 Дзецям пра звераняў. 17.05, 19.25 Музычны момант. 17.10 Выбары-94. 17.55 "Шаўковы шлях" прадпрымальніцтва. 18.30, 21.30 Інфарм ТБ. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль. 19.30 Ура! Камедыя. "Аперацыя "Ы" і іншыя прыгоды Шурыка". Маст. фільм. 21.10 Тэлемагазін. 21.15 Тэлеслужба бяспекі. 21.45 Спартыўныя навіны. 22.00 Ваш стыль. 22.05 Вячэрні звон. 23.05 Фінал чэмпіянату свету па міні-футболе сярод студэнтаў. Расія — Іспанія.

ПЯТНІЦА, 21.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Пад купалам Сусвету. 8.20 Надвор'е. 8.30 Пяць хвілін на жарты. 8.40 "Верне-вер". Мультфільм. 9.00 Тэлебачанне — школе. Прыродазнаўства. Расліны і жывёлы вадаёмаў. 9.20 "Маё каханне, мой смутак". 10.20 "Я + Я". Мужчына і жанчына. 10.55 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Науцілус". Праграма для аматараў турызму і адпачынку. 11.15 У нас дома. Праграма для сям'і. 11.50 "Бімбат". Марсельеза. 12.15-13.00 Настальгічны дывертысмент. Гісторыя ДАВТа Беларусі ў асобах. Частка 2-я. 16.05 Праграма перадач. 16.10 Заключны канцэрт фестывалю мастацтваў Беларускага універсітэта культуры. Перадача 2-я. 17.10 "Бімбат". Знаёмства з дзіцячым тэатрам гімназіі № 37 г. Мінска. 17.30 Навіны (з сурдаперакладам). 17.40 "Еўрапейскі калейдаскоп". 18.10 Абласныя навіны (Магілёў). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 19.00 Эканамікст. 19.10 "Вытокі". Урокі беларускай мовы. Прэм'ера цыкла. 19.25 "Таму што любілі..." Памяці тэлежурналіста Аляксандра Чуланава. 19.55 Актуальнае інтэрв'ю. Прымае ўдзел старшыня КДБ Беларусі генерал-лейтэнант У. Д. Ягораў. 20.15 Студыя "Тэлесябрына". Падарункі на добры настрой. 20.30 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 20.35 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Пяць хвілін на жарты. 21.40 Пад купалам Сусвету. 21.50 Надвор'е. 22.00 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння - "Белае сонца пустыні". Маст. фільм.

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца. 6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны. 7.00 Працяг праграмы "Раніца". 8.00 Сарока. 8.25 "Дзікая Роза". 9.00 Агарод круглы год. 9.30 А. Глазуноў. Паэма-фантазія "Мора". 14.00 "Тарачаў і іншыя". 15.00 "Кэтвізл". Тэлесерыял для дзяцей. 16.00 Рок-урок. 16.50 Свет сёння. 17.00 Чалавек і закон. 17.35, 20.30 Надвор'е. 17.40 Дакументы і лёсы. 18.00 Бамонд. 18.20 "Дзікая Роза". 18.50 Поле цудаў. 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 Чалавек тыдня. 21.05 "Вуліцы Сан-Францыска". 22.05 "Погляд" з А. Любімавым. 23.10 Хакей. Чэмпіянат МХЛ. ЦСКА — "Пардаўгава" (Рыга). У перапынку — Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

6.30 Формула-730. 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі. 7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей. 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі. 8.25 Паехалі. 8.35 "Санта-Барбара". 9.25 Здарова жывеш. 9.40 У свеце жывёл. 10.35 Тэлегазета. 10.40 Сялянскае пытанне. 15.20 Студыя "Рост". "Кенгуру". 15.50 Там-там навіны. 16.05 Свята кожны дзень. 16.15 Новая лінія. 16.55 Дысней па пятніцах. "Знакамітыя ліхадзеі Дыснея". 17.55 SOS. 18.05 Лаўка сусветаў. 19.25 Падрабязнасці. 19.35 "Санта-Барбара". 20.30 Маскі-шоу. 21.05 "К-2" прадстаўляе: "Абзац". 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Спартыўная карусель. 22.30 "Кеніг і яго кампанія". Маст. фільм (ФРГ). 23.55 Зоркі гавораць.

Санкт-Пецярбург

14.25, 21.10 Тэлемагазін. 14.45 Ура! Камедыя. "Аперацыя "Ы" і іншыя прыгоды Шурыка". Маст. фільм. 16.20 "Казка за казкай". Адказы на пісьмы. 17.10 Выбары-94. 17.55 Храм. 18.30, 21.30 Інфарм ТБ. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль. 19.30 "Меладрама з замахам на забойства". Маст. фільм. 20.35 "Русь мая..." Канцэртная праграма. 21.15 Тэлеслужба бяспекі. 21.45 Спартыўныя навіны. 22.00 Ваш стыль. 22.05 Анталогія замежнага кіно. "Народжаны перамагаць". Маст. фільм (ЗША).

СУБОТА, 22.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Эканамікст. 8.20 Пад купалам Сусвету. 8.30 Надвор'е. 8.40 Пяць хвілін на жарты. 8.50 "Белае сонца пустыні". Маст. фільм. 10.15 Здароўе. Тэлечасопіс. 10.40 Паказвае Магілёў. 11.10 "Лулу — анёл кветак". Мультсерыял. 11.45 "Край". Урсула Радзівіл. 12.15 Прафесійны бокс. Турнір. "Суперчэмпіён Беларусі". 13.45 "Елізавета Англійская з-пад Смаленска". Сустрэча з Л. Касаткінай. 14.25 "Хата сям'ёй багата". Да Міжнароднага года сям'і. 15.10 Асілак. Тэлевізійны спартыўны клуб. Прамая лінія. 16.10 Паміж намі, жанчынамі. Тры навелы пра добрыню. 16.50 "Чарапашкі ніндзя". 17.15 "Падводныя лодкі — акулы са сталі". Дак. серыял (Аўстралія). 17.45 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". 19.05 "Нов і К"-топ-10. 20.05 Міжнародныя спартыўныя навіны. 20.35 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Пяць хвілін на жарты. 21.45 "Зоркі" на экране. Тэлевізійны трохсерыйны маст. фільм. "Дым". 3-я серыя. 22.55 Пад купалам Сусвету. 23.05 "Каскад". Пра бізнес і бізнесменаў. 23.20 Відзьма-нявідзьма. Навіны кіна-відэа-аўдыё. 0.20 Футбол. Фінал кубка Беларусі сярод жаночых каманд. 2-гі тайм.

Канал "Астанкіна"

6.30 Суботняя раніца дзелавога чалавека. 7.15 Спорт-шанц. 7.45 Слова пастыра. Мітрапаліт Кірыл. 8.00 Покліч джунгляў. 8.30 Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір". 10.00 Ранішняя пошта. 10.30 Медыцына для цябе. 11.00 Без паўзы. 11.15 Смак. 11.35 Пераадоленне. 12.05 "Жыццё за жыццё". Маст. фільм (1916 г.) 13.35 Галасы Расіі. Спявае Ю. Учватава (Саранск). 13.50, 22.50, 23.50, 0.50 Навіны. 14.00 Дыялог у прамым эфіры. 14.40 Кніжны двор. 15.10 "Спасціжэнне дэмакратыі". Фільм 3-ці "Аўтарытарныя правадыры". 16.10 "Жыццё заапаркаў". Тэлесерыял (ЗША). 16.50 Разумнікі і разумніцы. 17.45 Да і пасля... 18.40 "Каманда ў капелюшах". Тэлесерыял (ЗША). 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Навіны плюс. 20.35, 23.00 Надвор'е. 20.45 "Зігфельд. Мужчына і яго жанчына". Тэлефільм. 2-я серыя (ЗША). 21.40 Клуб "Белы папугай". 22.25 Каханне з першага погляду. 23.05 "Саламяныя сабакі". Маст. фільм.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі. 7.25 Мульці-пульці. "Фанцік. Першабытная казка". 7.45 Студыя "Рост". "Наш Леў Іванавіч". 8.15 Піліграм. 9.00 Парламенцкі тыдзень. 9.45 Музыка ўсіх пакаленняў. 10.15 Як жыць будзем? 11.00 "С. В. Д." Маст. фільм (1927 г.) 12.40 Сялянскае пытанне. 13.20 Дэ факта. 13.35 "Эдэра". Маст. фільм (Італія). 14.30 Тэлеэрудыт. 14.35 "Расія маладая". Дак. фільм. 11-я серыя. 15.40 Футбол без межаў. 16.25 Пецярбургскія гісторыі. Г. Вішнеўская. 16.55 Прэм'ера мультфільма "Робін Гуд" (ЗША). 17.55 Свята кожны дзень. 18.05 "Сентыментальнае падарожжа ў краіну "Бітлз". 18.50 Тэлеэрудыт. 19.25 "Далёкія галасы, застылыя жыцці". Маст. фільм (Вялікабрытанія). 21.05 Зусім сакрэтна. 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Спартыўная карусель. 22.30 Праграма "А". 23.30 Зоркі гавораць. 23.35 "Гогаль-могаль". Кінакамедыя (Польшча).

Санкт-Пецярбург

9.00 "Гадзіна Фрэйзера". Рэлігійная праграма. 9.30 "Пераступіць мяжу". Маст. фільм. 1-я серыя "Папяровы змей". 11.00 "Ну, пачакай!" Мультпраграма. 11.40 "Музыка на заказ". Кампазітар Веніямін Баснер. 12.10 Чароўная лінія. 12.25 "Дрэнная прыкмета". Кароткаметражны маст. фільм. 13.00 Хуткая дапамога. 13.30 "Корцік". Маст. фільм. 15.00 "Старадаўняя лютневая музыка". Выконвае камерны ансамбль Свярдлоўскай філармоніі "Рэнесанс". 15.20 "На рынгу". Мультфільм. 15.30 "Марыяна першая". Мультфільм. 16.00 "Ды збудзецца яно". Дак. фільм. 16.50 Казкі Андэрсена. 17.10 Студыя "Уяві". 17.20 "Антрэ". Цыркавая праграма. 17.40-21.15 Уік-энд з дэтэктывам. 18.10 Экспрэс-кіно. 18.30, 21.30 Інфарм ТБ. 18.55 "Крыху ўлева ад Паўночнага полюса". Навукова-папулярны фільм. 19.10 Вялікі фестываль. 19.25 "Страсці". Маст. фільм. 21.00 Кіжы. Вопыт журналісцкага расследавання. 21.50 Ваш стыль. 21.55 "Аранж ТБ" прадстаўляе: "Не хочаш — не глядзі". 23.05 "Абуза". Маст. фільм.

НЯДЗЕЛЯ, 23.10

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі. 8.10 Пад купалам Сусвету. 8.20 Пяць хвілін на жарты. 8.30 Слова да чалавека. 9.00 Справы вайсковыя. 9.45 Беларускі тур. Падарожжы, сустрэчы, адпачынак. 10.05 "Чарапашкі ніндзя". 10.30 "Зоркі" на экране. Тэлевізійны трохсерыйны маст. фільм "Дым". 3-я серыя. 11.40 "АВС-клуб". Англійскую мову вучым самі. 11.55 Дайнова-інвест: "МТУ. Лепшыя хіты". 12.25 Аэробіка. Урокі Наталлі Наважылавай. 12.55 Нядзельнае тэлекафэ "Мая мама". 13.25 Існасць. Духоўная праграма. 13.55 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок". "Беларусь — Германія: шлях у Еўропу". 14.40 Барбі-лато. 15.05 Вяскоўцы. Саўгас "Ждановічы" Мінскага раёна. 15.35 "Чарапашкі ніндзя". 16.00 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. "Дынама" (Мінск) — "Тарпеда" (Мінск). 2-гі тайм. 16.50 "Тінес-шоу". 17.20 Дзелавы веснік. 17.35 "Квартэт "Ква-ква". Мультфільм. 17.45 Праспект. Інфармацыйна-аналітычная праграма. 18.15 Запрашаем на вячоркі. "Восеньскі кірмаш". 19.25 Тэлекрама. 20.00 Панарама. 20.35 Калыханка. 20.55 Пад купалам Сусвету. 21.05 Пяць хвілін на жарты. У гасцях у В. Філатава — "Хрыстафор". 21.15 "Сінема" прадстаўляе. "Міньён застаецца". Маст. фільм (Італія). 23.10 Камп'ютэрны палігон. Аналітыка, графіка, мастацтва. 23.30 Начное рандэву. Музычна-забаўляльная праграма. 0.15 Рэспубліканскія спаборніцтвы па гарадошным спорце на прыз Беларускага тэлебачання.

Канал "Астанкіна"

7.15 Алімпійская раніца. 7.50 Тыраж "Спортлато". 8.00 Марафон-15. 8.30 Раным-рана. 9.00 Палігон. 9.30 Пакуль усе дома. 10.00 Ранішняя зорка. 10.50 Пад знакам "пі". 11.35 X Міжнародны фестываль тэлевізійных праграм народнай творчасці "Вясёлка". "10 лепшых з Аўстрыі". 12.15 Эканоміка і рэформы. 12.45 "Шпаргалка" з падарункам. 13.00 "Падводная адысея каманды Кусто". Дак. серыял. 13.50, 17.00, 22.50, 23.50 Навіны. 14.00 "Стратэгія Перамогі". Дак. серыял. Фільм 4-ы "Каўказскі шчыт". 14.55 Жывое дрэва рамёстваў. 15.00 Клуб падарожнікаў. 15.50 У гасцях ва ўлады. Герашчанка — сын Герашчанкі. 16.30 Японія з А. Калошыным. 17.10 Тэлелоцыя. 17.25 "Баскетбольная ліхаманка", "Сапраўдныя паляўнічыя на прывіды". Мультсерыял (ЗША). 18.20 Уся Расія. 18.55 Надвор'е. 19.00 Ален Дэлон у маст. фільме "Самурай" (Францыя-Італія). 21.00 Нядзеля. 21.50 Спартыўны ўік-энд. 22.10 IV Маскоўскі міжнародны тэлевізійны фестываль "Ступень да Парнаса". 1-ы тур.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі. 7.25 "Па сцежках Чаткала". Дак. фільм. 7.40 Студыя "Рост". "Хто на новенькага?" 8.10 Наш сад. 8.40 Снеданне для чэмпіёнаў. 9.10 Аты-баты... 9.40 Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з "Малой Еўропы". 10.10 Рускае лато. 10.55 Кінафестываль "Дзень Перамогі". "69-я паралель". Дак. фільм. 12.10 Сялянскае пытанне. 13.20 Не высечы... 13.35 "Эдэра". Маст. фільм (Італія). 14.30 Танцавальны марафон. 15.00 Рымская сям'я Талстых. 15.45 Каробка перадач. 16.00 Белая варона. 16.45 Свята кожны дзень. 17.00 Чароўны свет Дыснея. "Гуфі і яго каманда", "Чорны плашч". 17.55 Вас запрашае Аляксандр Абдулаў. 19.25 Жан-Поль Бельмандо ў фільме "Пачвара" (Францыя). 21.25 У Ксюшы. 22.20 Аўтаімгненне. 22.25 Спартыўная карусель. 22.30 Вячэрні салон. 23.30 Зоркі гавораць.

Санкт-Пецярбург

8.00 "Гаючае слова". Праграма-набажэнства. 9.30 "Курортны гарадок". Тэлефільм. 9.45 "Клемянціна". Мультфільм. 10.15 Экспрэс-кіно. 10.30 Сустрэча з Альбертам Асадуліным. 11.00 Нядзельны лабірынт. 12.35 "Чорныя ступні". Маст. фільм для дзяцей. 14.00 Падарожжа па Усходзе. 14.10 Тэлеклуб "Класіка". Дырыжор Карла Марыя Джуліні. 15.20 Парады садаводам. 15.30 Чэмпіянат Італіі па футболу. 17.20 Этнасы Зямлі. 17.50 Залаты ключ. 18.05 Зебра. 18.50 "Сцюардэса". Кароткаметражны маст. фільм. 19.30 Інфарм ТБ. 19.55 "Аляска, сэр". Маст. фільм. 21.30 Ваш стыль. 21.40 Дом кіно. 22.40 Адам і Ева +.

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

З надыходам халодных дзён колькасьць злачынстваў у Гарадзенскай вобласьці ня зьменшылася. За тыдзень іх зарэгістравана 170. У іх ліку 2 забойствы, 11 цялесных пашкоджаньняў, згвалтаваньне, 3 разбойных напады, 8 рабаваньняў, 45 крадзяжоў дзяржаўнай і 83 - асабістай маёмасьці грамадзян.

У 20 дарожных здарэньнях 5 чалавек загінула і 18 паранена, ў чатырох з іх вінаватыя нецьвярозыя вадзіцелі.

ЗАБОЙСТВЫ

Ноччу з панядзелка на аўторак у в.Дзенькаўцы Мастоўскага р-на паміж мужам і жонкай, дарэчы, абодва злоўжывалі моцнымі напоямі і былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў, адбыўся трагічны разлад, сьведкаў якога, аднак, не засталося, бо ўсё адбывалася ў хаце. Відавочна, што спачатку галава асірацелага сямейства адзіным ударам нажа ў сэрца забіў жонку, а потым... павесіўся на дзьвярах.

* * *

У в.Крынічнае Гарадзенскага р-на, у адрозьненьне ад мастоўскага выпадка, забіты майстар вайсковага лясніцтва не накладваў на сябе рукі. У гэтым яму "дапамог" нідзе не працуючы 33-гадовы гарадзенец, які літаральна "змалаціў" ахвяру нагамі.

Абодва здарэньні аб'ядноўвае адна і тая ж акалічнасьць - прысутнасьць "зялёнага зьмея".

АБРАБАВАНЬНІ

Хваля "крамных" абрабаваньняў пракацілася ў аўторак па Гарадзеншчыне. Сцэнар іх вельмі падобны.

Так, у Горадні рабаўнік зайшоў у магазін "Гарачы хлеб" па вул.Савецкіх Пагранічнікаў і вырваў з рук пакупніцы кашалёк са 180 далярамі і 70 тысячамі "зайцоў".

* * *

Яшчэ адзін зламысьнік, ужо ў Наваградку, таксама пакуль гуляе на волі.

Увечары па вул.Міцкевіча ён сустрэў у цёмным месцы загадчыцу магазіна "Паўлінка" і, стукнуўшы жанчыну чымсьці па галаве, забраў у яе дзьве кайстры з прадуктамі харчаваньня, а таксама сумачку, у якой знаходзіліся пашпарт, 120 тысяч рублёў і залатыя завушніцы.

* * *

Таксама нахабна дзейнічаў і рабаўнік з Ліды ў в.Міжэвічы Слонімскага р-на. Калі стала вечарэць, ён зайшоў у краму "Прамтавары" і вырваў з рук загадчыцы дзённую выручку - 175 тысяч рублёў.

З грашыма злодзей сеў у легкавік і зьнік, але пры ўездзе ў Ваўкавыск быў затрыманы. Падчас агляду яго аўтамабіля была знойдзена пнеўматычная вінтоўка.

РАЗАНІНА

А вось пік панажоўшчыны прыйшоўся на сераду. Менавіта ў гэты дзень найбольш агрэсіўная і нявытрыманая частка жыхароў вобласьці "практыкавалася" у трапнасьці нажавых "уколаў". Ва ўсіх выпадках секундантам "паядынкаў" выступаў "зялёны зьмей".

Так, у Слоніме ён "назіраў" за сваркай двух малайцоў - слонімца і жыхара Дзятлава. У выніку госьць з раненьнем грудной клеткі трапіў у шпіталь.

* * *

У Наваградку месцам "рынгу" стала сталовая N 1, у якой жыхар райцэнтра, які знаходзіўся ў нецьвярозым стане, пусьціў кроў двум, таксама п'яным землякам.

* * *

У Бярозаўцы 36-гадовы мужчына, які толькі чатыры дні прабыў на волі, "адзначыў" вяртаньне з месцаў зьняволеньня ударам нажа ў жывот сваёй знаёмай.

* * *

Амаль як у вядомай кінакамедыі дзейнічаў 18-гадовы абібока з вабласнога цэнтра, які за чаркаю паласнуў свайго равесьніка брытвай па шыі.

КРАДЗЯЖЫ ТЫДНЯ

Серада стала ў крымінальным календары ня толькі фехтавальна-кухонным днём. Толькі за адну ноч "разбамбілі" чатыры гандлёвыя кропкі спажывецкай кааперацыі: у в.Пасуцічы Зельвенскага р-на, в.Нарушаўцы Ашмянскага, в.Марціянаўцы Ваўкавыскага і Валеўцы Наваградзкага раёнаў.

Праз суткі гэткі ж лёс напаткаў гандлёвы "дом " спажыўсаюза ў в.Пагародна Воранаўскага р-на.

Ва ўсіх выпадках урон вагаецца ад 80 да 300 тысяч рублёў.

У гэтым сэнсе крыху адрозьніваюцца страты ў Валеўцах, дзе злачынцы вынесьлі з крамы тавару на 2,3 млн. рублёў. Але, відаць, няма больш сэнсу гаварыць пра памер стратаў, няспраўную сігналізацыю, слабыя дзьверы і г.д. Колькі можна?

На думку некаторых прафесіяналаў з абласнога УУС, кардынальна выправіць становішча з захаваньнем маёмасьці можа толькі прыватызацыя гандлёвых кропак, бо, як правіла, у прыватных крамах паўторных крадзяжоў не бывае. Свая сарочка, як кажуць...

ЗБРОЯ

Відаць ня чуў 47-гадовы жыхар Берасьця аб пільнасьці гарадзенскай міліцыі. У адваротным выпадку не "кульнуў" бы ён, знаходзячыся за рулём, шклянку моцнага напою. Напэўна, таксама, не насіў бы пры сабе і цудоўны "Галезі-Брэгія" - сямізарадны пісталет італьянскай вытворчасьці. Кажуць, добры быў пісталет...

НІЗАСЬЦІ

22-гадовы трактарыст калгаса "Ленінскі шлях" Карэліцкага р-на згвалтаваў 72-гадовую аднавяскоўку ў яе хаце і ў дадатак забраў у старой 15 тысяч рублёў і 5 бутэлек гарэлкі.

* * *

Ў в.Балічы Шчучынскага р-на 39-гадовы айчым у сівушным дурмане зьнявечыў пасынка-трэцякласьніка. З чэрапна-мазгавымі траўмамі хлопчык быў дастаўлены ў шпіталь.

НЯШЧАСЬЦІ

Цяжка сказаць, якія эксперыменты праводзілі два маладыя гарадзенцы у кватэры дома N 15 па Азёрскай шашы, з якой яны і былі шпіталізаваны пасьля тэрмічнага апаленьня тулава і рук.

Па словах пацярпелых, у кватэры выбухнула скараварка.

І.ДАНІЛОВІЧ.



ПОЛЬСКАЯ ВЫСТАВА Ў ГОРАДНІ

З 10 па 14 кастрычніка ў спартыўнай зале Гарадзенскага медыцынскага інстытута дзейнічала міжнародная выстава "Лодзінскі макрарэгіён у Горадні", зарганізаваная Гарадзенскім аблвыканкамам і Саюзам палякаў Беларусі. На ёй свае вырабы (адзеньне, абутак, медыкаменты, будматэрыялы, прадукты харчаваньня і іншае) прадстаўлялі фірмы Лодзінскага, Петрыкоўскага, Плоцкага, Серадзкага і Скерневіцкага ваяводстваў.

Фатаграфаваў А.УЛАДАСЕВІЧ

«ПАЛІТЭХНІК» ПРАЛЯЦЕЎ, СКА ЯШЧЭ ЗАХОЎВАЕ ШАНЦЫ

Няўдала правялі свае гульні на эўрапейскіх кубкавых турнірах беларускія гандбольныя клубы "Палітэхнік" і СКА з Менску.

Армейцы на сваёй пляцоўцы прайгралі італьянскаму "Трыесту" з лікам 21-23. "Палітэхнік" свае гульні па дамоўленасьці праводзіў у Славеніі супраць "Алімпа". Першая гульня 25-19 на карысьць гаспадарынь. Паўторная сустрэча закончылася з лікам 21-20 на карысьць мянчанак. Па выніку гульняў да наступнага кола сабораніцтваў трапілі славенкі.

Г.ВАСІЛЕВІЧ.

ГУЛЬНЯ ЁСЬЦЬ - ВЫНІК БУДЗЕ

Два паражэньні запар пацярпелі ў розыгрышу кубка МХЛ хакеісты менскай "Цівалі". Спачатку менчукі прайгралі ў Казані мясцовай "Іціл і" - 2:3, а затым у родных сьценах уступілі аднаму з лідэраў Заходняй зоны "Тарпеда" (Яраслаў) - 1:2.

У супрацьвагу сваім больш вопытным калегам выступаюць у адкрытым чэмпіянаце Расеі хакеісты "Нёмана" з Горадні. На сваёй пляцоўцы гарадзенцы перамаглі Санкт-Пецярбургскі СКА-2 - 6:1 і згулялі ў паўторнай сустрэчы ўнічыю - 6:6.

ЁСЬЦЬ ПЕРШЫЯ ПЕРАМОГІ І ПЕРШАЕ ВЫДАЛЕНЬНЕ

Алімпійская і нацыянальная зборныя Беларусі па футболу правялі ў Менску чарговыя сустрэчы ў цыкле адборачных гульняў алімпійскага турніру і чэмпіянату Еўропы супраць зборных аб'яднанага герцагства Люксембург.

Алімпійцы атрымалі буйную перамогу - 3:0, а нацыянальная зборная перамагла сваіх сапернікаў з лікам 2:0.

Г.Г.

ЛІНІКЕР АДЫХОДЗІЦЬ

Лепшы футбаліст апошняга дзесяцігоддзя Англіі Гары Лінікер разьвітаўся з футболам. Апошнія два гады Гары гуляў у Японіі, але старыя і новыя траўмы не дазваляюць яму гуляць на поўную сілу.

(з.д.)

«BELARUS» БАНК ЗЬНІЖАЕ ПРАЦЭНТЫ

Спакусіўшыся на высокія гадавыя працэнты "Belarus" банка, многія гарадзенцы зрабілі ўклады валюты на яго рахунак. Як жа былі зьдзіўлены ўкладчыкі, калі наўзамен абяцаных 23% гадавых атрымалі ў кастрычніку ўсяго 13%.

ГАРАЦЬ КАСТРЫ «ЗЯЛЁНЫМІ»

Непашчасьціла пінчуку Рыгору В. на гандлярскай выправе да Расеі. Спакуса набыць больш танных далераў завяла Рыгора да Першапрыстольнай, дзе мясцовыя аферысты прадалі бедалагу купюрамі розных варыянтаў аж тысячу падробленых далераў.

Дазнаўшыся ўжо дома аб няўдачы, спадар В. зрабіў вогнішча з набытку.

ПРАМЯНЯЛІ СПОРТ НА ГАНДАЛЬ

У Лідзе на пляцы недабудаванага стадыёна адкрыўся рэчавы рынак. Рынак універсальны: тут можна купіць ня толькі шыкоўную імпартовую рэч, а і падабраць па густу самы сучасны легкавік. На дзіва ўладаў горада, перамены на спартпляцоўцы аказаліся ня ўсім да спадобы. Большасьць лідчукоў схіляецца да думкі, што здароўе - гэта першаснае, а дабрабыт - другаснае.

КОНСУЛ САМАТУЖ ШУКАЕ ЖЫТЛО

Генеральны консул Рэспублікі Польшча ў Горадні М.Машкевіч недачакаўшыся абяцанай кватэры ад гарадзенскіх уладаў саматуж пачаў шукаць жытло. Пошукі аказаліся пасьпяховымі. Консул знайшоў сабе памяшканьне па густу на тэрыторыі МГК "Маналіт". Мяркуецца, што дзён праз 10-14 пан Мар'яныш Машкевіч з сям'ёй зойме ахвяраваныя канцэрнам апартаменты.

ФАБРЫКА ІЛЬНУ

На Наваградчыне пачала перапрацоўку ільносаломкі адзіная на Гарадзеншчыне фабрыка ільну. Прадпрыемства маладое, яго заснавальнік - міжгаліновы канцэрн "Маналіт". Прэзыдэнт МГК "Маналіт" С.Буйніцкі расказаў карэспандэнту "Пагоні": "Мы больш трох год пераадольвалі бюракратычныя прэпоны, каб мець сваю вытворчасьць па перапрацоўцы ільну. Сёньня фабрыка набірае праэктную магутнасьць, а неўзабаве яе вырабы будуць у крамах."

ЮБІЛЕЙНЫ СЕЗОН ЮБІЛЯРА

Трупай Слонімскага дзяржаўнага драматычнага тэатру быў наладжаны фэст, прысьвечаны 60-гадоваму юбілею мастацкага кіраўніка тэатру М.Х.Варвашэвіча. Спадар Варвашэвіч ў год свайго юбілею распачаў 30-ты сезон у тэатры. За гэты час пад яго кіраўніцтвам на сцэне Слонімскага тэатру творчым калектывам пастаўлена больш за 30 спектакляў па творах беларускіх класікаў.

«ЗАЛАТЫ ВІЦЯЗЬ»

У Ціраспалі прайшоў трэці Міжнародны кінафестываль славянскіх і праваслаўных народаў.

Галоўны прыз - "Залаты Віцязь" - атрымаў беларускі рэжысёр М.Паташук за мастацкую трагікамедыю "Кааператыў "Палітбюро".

Наступны фестываль славянскіх народаў адбудзецца праз год у баўгарскім горадзе Тырнава.

ШЛЯХАМ НАПАЛЕОНА НА БЕЛАРУСЬ

Па запрашэньню турбюро "Гродна-Ліможа" Горадню наведала вайсковая дэлегацыя 15-ай транспартнай дывізіі Ўзброеных Сілаў Францыі, заснаванай яшчэ Банапартам Напалеонам. Французскіх вайскоўцаў цікавіць ваенны шлях войскаў Напалеона на Беларусі падчас паходу на Маскву. Асаблівую цікаўнасьць у французаў выклікаюць дзеяньні на нашай зямлі брата Напалеона - Жарэса. Існуе паданьне, што на Гарадзеншчыне Жарэс закапаў скарб Банапарта. Французы таксама маюць на мэце стварыць сумесную дасьледчую групу для пошукаў гэтага скарбу.

Дарэчы, ёсьць ахвотнікі да ўдзелу ў пошуках як з французскага, так і з беларускага боку.

ПАДКЛАДЫ НАЎЗАМЕН ПЕРАВЯЗАЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

На адрас вабласнога дзіцячага шпіталю Горадні прыйшла гуманітарная дапамога.

На жаль, наўзамен чаканых лекаў і бінтоў у ёмістых пакунках былі падклады для кабет і супрацьзачаткавыя сродкі. Гэта ня першы выпадак блытаніны з гуманітарнай дапамогай. Раней да дзіцячага шпіталю былі дасланы лекі, прызначэньне якіх не змаглі вызначыць фармацэўты.

Але дзіцячыя лекары Горадні не трацяць аптымізму і спадзяюцца абмяняць гэты гуманітарны груз на патрэбнае дзецям.

Ул.інф.

"ПАГОНЯ"

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд "БАЦЬКАЎШЧЫНА".

Адрас рэдакцыі: 230023, г.Горадня, вул.Дамініканская, 1.

Тэлефоны: 45-29-96, 45-41-83.

Газета выдаецца па пятніцах 4 разы на месяц.

Пры перадруку спасылка абавязкова.

Індэкс 63124. Ліцэньзія № 465.

Фотанабор, афсэтны друк.

Гарадзенская вабласная ўзбуйненая друкарня: 230003, г.Горадня, вул.Паліграфістаў,4.

Заказ 4014.

Наклад 4592 паасобнікі.